# Грамадзянін і сьледзтва: прававыя і псыхалягічныя аспэкты

Асамблея Дэмакратычных Няўрадавых Арганізацыяў

vytoki.net

Сэрыя выдаецца пры падтрымцы амбасады Нідэрляндаў у Польшчы.

Пад рэдакцыяй Уладзімера Роўды

**Звозкаў Б., Лабановіч Е. Грамадзянін і сьледства: прававыя і псыхалягічныя аспэкты.**—Мн.:Выканаўчае бюро Асамблеі Дэмакратычных Няўрадавых Арганізацыяў,1999. -72с.

**Выканаўчае бюро**
**Асамблеі Дэмакратычных Няўрадавых Арганізацыяў**

Адказная за выпуск:
каардынатар выдавецкіх праграмаў Паліна Карташова
вул.К.Маркса 6\36, Менск
тэл.\факс (017) 220 73 74
e-mail: ngo@user.unibel.by
http://ngo.unibel.by

© А.М. 1999

# Зьмест

РАЗЬДЗЕЛ I
ПЫТАНЬНІ ЗАКАНАДАЎСТВА

КРЫМІНАЛЬНА-ПРАЦЭСУАЛЬНЫ КОДЭКС .............. 6
КОДЭКС АБ АДМІНІСТРАЦЫЙНЫХ ПРАВАПАРУШЭНЬНЯХ .............. 30

РАЗЬДЗЕЛ II
ПЫТАНЬНІ ЮРЫДЫЧНАЙ ПСЫХАЛЁГІІ .............. 35

РАЗЬДЗЕЛ III
І ЎСЁ-ТАКІ ВАС «ЗАЧАПІЛІ».............. 57

ДАДАТКІ .............. 68

vytoki.net

РАЗЬДЗЕЛ І ПЫТАНЬНІ ЗАКАНАДАЎСТВА

# КРЫМІНАЛЬНА-ПРАЦЭСУАЛЬНЫ КОДЭКС

(вытрымкі і камэнтары да асобных артыкулаў)

*Артыкул71.* **Недатыкальнасьць жытла, ахова асабістага жыцьця і тайны перапіскі**

Грамадзянам гарантуецца недатыкальнасьць жытла. Ніхто ня мае права без законнай падставы ўвайсьці ў жытло супраць волі асобаў, якія ў ім жывуць. Асабістае жыцьцё грамадзянаў, тайна перапіскі, тэлефонных перамоваў і тэлеграфных паведамленьняў ахоўваюцца законам. Ператрус, выманьне, дагляд памяшканьняў у грамадзянаў, накладаньне арышту на карэспандэнцыю і выманьне яе ў паштова-тэлеграфных установах могуць рабіцца толькі на падставе і ў парадку, устаноўленым дадзеным Кодэксам. Міліцыя павінна пазнаёміць вас з пастановай аб ператрусе, выманьні і да т.п. пад подпіс; на пастанову павінна быць санкцыя пракурора.

*Артыкул 8.* **Зьдзяйсьненьне правасудзьдзя толькі судом**

Правасудзьдзе па крымінальных справах зьдзяйсьняецца толькі судом. Ніхто ня можа быць прызнаны віноўным у зьдзяйсьненьні злачынства, а таксама паддадзены крымінальнаму пакараньню іначай як па выраку суду і ў адпаведнасьці з законам.

*Артыкул 14.* **Забесьпячэньне падазраванаму, абвінавачванаму і падсуднаму права на абарону**

Падазраваны, абвінавачваны і падсудны маюць права на абарону. Асоба, якія робіць дазнаньне, сьледчы, пракурор і суд абавязаныя забясьпечыць падазраванаму, абвінавачванаму і падсуднаму магчымасьць абараняцца ўстаноўленымі законам сродкамі і спосабамі, а таксама ахову іхных асабістых і маёмасных правоў.

*Артыкул 48.* **Абвінавачваны**

Абвінавачванай прызнаецца асоба, у дачыненьні да якой ва ўстаноўленым дадзеным Кодэксам парадку вынесеная пастанова аб прыцягненьні ў якасьці абвінавачванай. Пасьля аддаваньня абвінавачванага пад суд ён называецца падсудным, а пасьля вынясеньня абвінаваўчага прысуду - асуджаным. Абвінавачваны мае права ведаць, у чым ён абвінавачваецца, і даваць тлумачэньні па прад'яўленым яму абвінавачваньні; прадстаўляць доказы; хадайнічаць; знаёміцца пасьля папярэдняга сьледзтва альбо дазнаньня з усімі матэрыяламі справы; мець абаронцу з моманту, прадугледжанага артыкулам 5 гэтага Кодэксу; удзельнічаць у судовым разьбіральніцтве ў судзе першай інстанцыі; даваць адводы; скардзіцца на дзеяньні і рашэньні асобы, якая робіць дазнаньне, сьледчага, пракурора і суд. Падсудны мае права на апошняе слова. Хадайніцтвы, якія мае права заяўляць абвінавачваны, могуць быць вусныя (заяўляюць падчас сьледчых дзеяньняў і абавязкова павінны заносіцца ў пратакол), альбо пісьмовыя (перасылаюцца па пошце заказным лістом з паведамленьнем; уручацца сьледчаму асабіста, а калі абвінавачваны знаходзіцца пад вартай, то перадаюцца праз адміністрацыю месца заключэньня, якая напрацягу 24 гадзінаў абавязаная перадаць пісьмовае хадайніцтва сьледчаму). Усе хадайніцтвы абавязкова падшываюцца да справы. Можна заяўляць хадайніцтва аб зьмене меры стрыманьня, аб выкліку і допыце сьведкаў, аб спыненьні парушэньняў сьледчым, аб спыненьні крымінальнай справы і г.д.

*Артыкул 49.* **Удзел абаронцы ў крымінальнай судавытворчасьці**

Абаронца дапускаецца да ўдзелу з моманту прад'яўленьня абвінавачваньня. У выпадку затрыманьня асобы, падазраванай у зьдзяйсьненьні злачынства, ці прымяненьня ў дачыненьні да яе меры стрыманьня, заключэньне пад варту да прад'яўленьня абвінавачваньня абаронца дапускаецца да ўдзелу ў справе з моманту аб'яўленьня асобе пратаколу затрыманьня альбо пастановы аб прымяненьні гэтай меры стрыманьня, але не пазьней 24 гадзінаў з моманту затрыманьня альбо заключэньня пад варту. Адна і тая ж асоба ня абараняць двух падазраваных, абвінавачваных ці падсудных, калі інтарэсы абароны аднаго зь іх супярэчаць інтарэсам іншага. Загадчык юрыдычнай кансультацыі альбо прэзыдыюм калегіі адвакатаў абавязаныя неадкладна, але не пазьней дваццаці чатырох гадзінаў з моманту звароту, прызначыць адваката для зьдзяйсьненьня абароны падазраванага, абвінавачванага альбо падсуднага. Загадчык юрыдычнай кансультацыі альбо прэзыдыюм калегіі адвакатаў, а таксама орган дазнаньня, папярэдняга сьледзтва, пракурор,





vytoki.net

суд, у вытворчасьці якіх знаходзіцца справа, у парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, маюць права вызваліць падазраванага, абвінавачванага, падсуднага цалкам альбо часткова ад аплаты юрыдычнай дапамогі. У выпадку такога вызваленьня загадчыкам юрыдычнай кансультацыі альбо прэзыдыюмам калегіі адвакатаў аплата працы абаронцы робіцца за кошт сродкаў калегіі адвакатаў, у іншых выпадках - за кошт бюджэту. Выдаткі па аплаце працы адвакатаў у парадку, вызначаным Радай Міністраў Рэспублікі Беларусь, адносяцца за кошт бюджэту і ў выпадку, калі адвакат удзельнічаў у дазнаньні, папярэднім сьледстве і ў судзе па прызначэньні. Пакрываньне выдаткаў дзяржавы ў гэтым выпадку можа быць ускладзенае на асуджанага. Любы чалавек можа быць затрыманы на 3 судняў (гл. камэнтар да арт. 119 КПК). У гэты пэрыяд ён зьяўляецца падазраваным. Сьледчыя ніколі не тлумачаць падазраванаму ягонае права мець абаронцу з моманту затрыманьня. Падазраванаму заўсёды даюць пазнаёміцца з пратаколам затрыманьня і адразу ж праводзяць допыт, ён падпісвае пратакол затрыманьня і пратакол допыту. У стандартным бляхку пратаколу затрыманьня і допыту ёсьць графа «хачу мець абаронцу з моманту...». Практычна заўсёды сьледчы прапаноўвае падазраванаму запісаць, што абаронца яму патрабуецца з моманту прад'яўленьня абвінавачваньня. Падазраваны мае права запісаць у гэтай графе пратаколу (яна падпісваецца асобна ад пратаколу), што абаронца яму неабходны з моманту затрыманьня. У такім выпадку ўжо максымум праз 24 гадзіны ва ўсіх сьледчых дзеяньнях (допытах і г.д.) будзе прымаць удзел абаронца, у прысутнасьці якога сьледчы ніколі адкрыта не ідзе на парушэньне закону. У тым выпадку калі затрыманы запіша, што ён хоча мець абаронцу з моманту прад'яўленьня абвінавачваньня, у сьледзтва ёсьць 3 судняў да моманту прад'яўленьня абвінавачваньня і заключэньня пад варту, а калі мера стрыманьня ў выглядзе заключэньня пад варту прыменена да прад'яўленьня абвінавачваньня (у сьледчага ёсьць такое права ў адпаведнасьці з артыкулам 85 КПК на тэрмін да 10 суднях), то ў сьледзтва ёсьць 13 суднях да прад'яўленьня абвінавачваньня і прыцягненьня абаронцы, напрацягу якіх з падазраванага можна «выбіць» любыя паказаньні. Пасьля гэтыя паказаньні кладуцца ў аснову абвінаваўчага заключэньня і прысуду. Адмовіцца ад гэтых паказаньняў можна на далейшым сьледзтве, альбо ў судзе, але суд, як





правіла давярае менавіта гэтым паказаньням, а не адмовам. Са зьместу часткі 3 камэнтаванага артыкулу вынікае, што абаронцамі могуць быць блізкія сваякі, але практыка паказвае, што пасьля прыняцьця ў 1993 годзе закону «Аб адвакатуры» гэтая норма трактуецца такім чынам, што абаронцамі могуць толькі тыя сваякі, якія зьяўляюцца адвакатамі. У выпадку, калі абвінавачваны альбо падазраваны патрабуе дапусьціць абаронцам проста блізкага сваяка, то сьледчы адмовіць. Аднак маюцца прэцэдэнты, калі па справах, якія маюць вялікі грамадзкі рэзананс (справа Шарамета, справа Чыгіра), сьледзтва вымушанае было дапусьціць абаронцамі блізкіх сваякоў.

*Артыкул 50.* **Запрашэньне, прызначэньне і замена абаронцы**

Абаронца зь ліку асобаў, указаных у артыкуле 49 гэтага Кодэксу, запрашаецца падазраваным, абвінавачваным альбо падсудным, іхнымі законнымі прадстаўнікамі, а таксама іншымі асобамі па даручэньні альбо са згоды падазраванага, абвінавачванага ці падсуднага. Па просьбе падазраванага, абвінавачванага, падсуднага абаронца прызначаецца дазнаўцам, сьледчым, судом (судзьдзём) праз калегію адвакатаў. У тых выпадках, калі ўдзел выбранага падазраваным, абвінавачваным ці падсудным абаронцы немагчымы напрацягу больш чым сямідзесяці дзьвюх гадзінаў з моманту заяўленьня такога патрабаваньня, а пры затрыманьні - напрацягу дваццаці чатырох гадзінаў з моманту затрыманьня, асоба, якая праводзіць дазнаньне, сьледчы, пракурор альбо суд мае права прапанаваць падазраванаму, абвінавачванаму альбо падсуднаму запрасіць іншага абаронцу альбо забясьпечваюць ім абаронцу праз юрыдычную кансультацыю. Абвінавачваны альбо падазраваны можа патрабаваць допуску канкрэтнага адваката. У тым выпадку, калі адвакат згодны, і сваякі абвінавачванага альбо падазраванага заключаць зь ім пагадненьне, сьледчы абавязаны дапусьціць гэтага абаронцу да ўдзелу ў справе. У іншым выпадку сьледчы выклікае дзяжурнага адваката з раённай юрыдычнай кансультацыі. Пасьля сваякі могуць заключыць зь ім пагадненьне.

*Артыкул 63.* **Доказы**

Доказамі па крымінальнай справе зьяўляюцца любыя фактычныя дадзеныя, на падставе якіх у вызначаным законам



vytoki.net

парадку органы дазнаньня, сьледчы і суд устанаўліваюць наяўнасьць альбо адсутнасьць небясьпечнага ўчынку, вінаватасьць асобы, якая зьдзейсьніла гэты ўчынак, і іншыя абставіны, маючыя значэньне для справядлівага вырашэньня справы. Гэтыя дадзеныя ўстанаўліваюцца: паказаньнямі сьведкі, паказаньнямі пацярпелага, паказаньнямі падазраванага, паказаньнямі абвінавачванага, заключэньнем экспэрта, рэчавымі доказамі, пратаколамі сьледчых і судовых дзеяньняў і іншымі дакумэнтамі.

*Артыкул 64.* **Зьбіраньне доказаў**

Асоба, якая праводзіць дазнаньне, сьледчы, пракурор і суд маюць права, у межах сваёй кампэтэнцыі, па справах, якія знаходзяцца ў іхнай вытворчасьці, выклікаць у парадку, устаноўленым дадзеным Кодэксам, любую асобу для допыту ці для дачы заключэньня ў якасьці экспэрта; праводзіць дагляды, ператрусы і іншыя, прадугледжаныя разгляданым Кодэксам сьледчыя дзеяньні; патрабаваць ад прадпрыемстваў, установаў, арганізацыяў, службовых асобаў і грамадзянаў прадстаўленьня прадметаў і дакумэнтаў, якія могуць устанавіць неабходныя па справе фактычныя дадзеныя; патрабаваць рэвізіяў. Доказы могуць быць прадстаўленыя падазраваным, абвінавачваным, абаронцам, пракурорам, а таксама пацярпелым, грамадзянскім ісцом, грамадзянскім адказчыкам, іхнымі прадстаўнікамі і любымі грамадзянамі, прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі. Усе сабраныя па справе доказы падлягаюць дасканалай, усебаковай і аб'ектыўнай праверцы з боку асобы, якія праводзяць дазнаньне, сьледчага, пракурора і суду. Падазраваны альбо абвінавачваны, а таксама абаронца могуць хадайнічаць аб допыце сьведкаў, аб прыцягненьні дакумэнтаў да матэрыялаў справы і г.д. Яны могуць гэтыя хадайніцтвы падаваць і ў суд, аднак калі размова пойдзе аб допыце дадатковых сьведкаў, то каб пазьбегнуць адмовы абароне неабходна забясьпечыць прысутнасьць сьведкі ў судзе, а таксама, каб ён не прысутнічаў да свайго выкліку ў залі судовага паседжаньня.

*Артыкул 66.* **Асобы, якія выклікаюцца ў якасьці сьведкі**

У якасьці сьведкі для дачы паказаньняў можа быць выклікана любая асоба, якой могуць быць вядомыя нейкія абставіны, якія трэба ўстанавіць па дадзенай справе. Ня могуць дапытвацца ў якасьці сьведкі: 1) адвакат, прадстаўнік прафсаюзу і іншай грамадзкай арганізацыі - аб абставінах,





якія ім сталі вядомыя ў сувязі з выкананьнем імі абавязкаў абаронцы альбо прадстаўніка; 2) асоба, якая ў сілу сваіх фізычных ці псыхічных недахопаў няздольная правільна ўспрымаць абставіны, маючыя значэньне для справы, і даваць праўдзівыя паказаньні. Для вырашэньня пытаньня аб здольнасьці асобы правільна ўспрымаць абставіны, маючыя значэньне для справы, і даваць аб іх праўдзівыя паказаньні, у некаторых выпадках запрашаюцца экспэрты. Удзел у справе законных прадстаўнікоў пацярпелага, падазраванага, абвінавачванага не выключае магчымасьці допыту гэтых асобаў у якасьці сьведкаў.

*Артыкул 67.* **Абавязкі сьведкі**

Сьведка абавязаны зьявіцца па выкліку асобы, якая робіць дазнаньне, сьледчага, пракурора, суду і даць праўдзівыя паказаньні: паведаміць усё вядомае яму па справе і адказаць на пастаўленыя пытаньні. Пры няяўцы сьведкі без уважлівай прычыны асоба, якая робіць дазнаньне, сьледчы, пракурор і суд маюць права для ягонага прымусовага прыводу. Суд мае права таксама накласьці на сьведку грашовае спагнаньне ў памеры да 30 рублёў*. За злоснае ўхіленьне ад яўкі ў суд, органы папярэдняга сьледзтва альбо дазнаньня сьведка нясе адказнасьць у адпаведнасьці з артыкулам 1661 альбо артыкулам 1662 Кодэксу Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэньнях. За адмову ад дачы паказаньняў сьведка нясе адказнасьць па артыкуле 178 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь, а за дачу ілжывых паказаньняў - па артыкуле 177 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь**. * Памер грашовага спагнаньня, указаны ў артыкуле 67, не зьмяняўся і ня быў вызначаны ў залежнасьці ад узроўню мінімальнай зарплаты, устаноўленай у Рэспубліцы Беларусь. (Заўвага складальнікаў) ** У адпаведнасьці з заўвагамі да артыкулу 177 Крымінальнага Кодэксу Рэспублікі Беларусь, не падлягаюць адказнасьці за злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 177, 178 указанага Кодэксу, блізкія сваякі асобы, якая зьдзейсьніла злачынства. (бацькі, дзеці, усынавіцелі, усыноўленыя, родныя браты і сёстры, дзед, бабка, унукі, а таксама муж). (Заўвага складальнікаў) Сьведка мае права адмаўляцца ад адказаў на канкрэтныя пытаньні, спасылаючыся на арт. 27 Канстытуцыі прыблізна з такой фармулёўкай: «Я адмаўляюся адказваць на гэтае пытаньне, паколькі інфармацыю, якая ўтрымліваецца ў маім адказе, можна будзе выкарыстаць супраць мяне, а ў адпаведнасьці з



vytoki.net

арт. 27 Канстытуцыі ніхто ня можа прымушацца да дачы паказаньняў супраць самога сябе». Так можна адмовіцца ад адказу на любое пытаньне. У такім выпадку сьледзтва ня зможа прыцягнуць сьведку да адказнасьці за адмову ад дачы паказаньняў. Апрача таго неабходна адзначыць, што за адмову ад дачы паказаньняў у адпаведнасьці з артыкулам 178 КК максымальнае пакараньне — 6 месяцаў папраўчых работ па месцы працы з адлічэньнем ад 5 да 20 % зарплаты. Гэтае пакараньне ня можа быць заменена ніякім іншым.

*Артыкул 68.* **Паказаньні сьведкі**

Сьведка можа быць дапытаным аб любых абставінах, якія трэба ўстанавіць па дадзенай справе, у тым ліку аб асобе абвінавачванага, пацярпелага і аб сваіх узаемаадносінах зь імі. Ня могуць служыць доказам дадзеныя, якія паведамляюцца сьведкам, калі ён ня можа ўказаць крыніцу сваёй дасьведчанасьці.

*Артыкул 70.* **Паказаньні падазраванага**

Падазраваны дае паказаньні па абставінах, якія паслужылі падставай для ягонага затрыманьня ці прымяненьня да яго меры стрыманьня, а таксама па іншых вядомых яму абставінах па справе.

*Артыкул 71.* **Паказаньні абвінавачванага**

Абвінавачваны мае права даць паказаньні па прад'яўленым яму абвінавачваньні, а таксама па іншых вядомых яму абставінах па справе і наяўных у справе доказах.

*Артыкул 84.* **Прымяненьне мераў стрыманьня**

Пры наяўнасьці дастатковых падставаў думаць, што абвінавачваны, знаходзячыся на свабодзе, схаваецца ад сьледзтва і суду ці будзе перашкаджаць устанаўленьню праўды па крымінальнай справе, ці будзе займацца злачыннай дзейнасьцю, а таксама для забесьпячэньня выкананьня прысуду асоба, якая праводзіць дазнаньне, сьледчы, пракурор і суд (судзьдзя) маюць права прымяніць у дачыненьні да абвінавачванага адну з наступных мераў стрыманьня: падпіску аб нявыезьдзе, асабістае паручыцельства альбо паручыцельства грамадзкіх арганізацыяў і працоўных калектываў, заключэньне пад варту. У дачыненьні да ваеннаслужачых можа выступаць у якасьці меры стрыманьня нагляд за імі камандаваньня вайсковых частак, у якіх яны





служаць. У дачыненьні да непаўналетніх у якасьці меры стрыманьня можа прымяняцца таксама нагляд бацькоў, апекуноў, а ў дачыненьні да паўналетніх, якія выхоўваюцца ў дзіцячых установах, - аддача пад нагляд адміністрацыі гэтых установаў. Пры адсутнасьці падставаў, якія робяць неабходным прымяненьне меры стрыманьня, абвінавачваны абавязаны зьяўляцца па выкліках і паведамляць аб перамене месца жыхарства.

*Артыкул 85.* **Прымяненьне меры стрыманьня да прад'яўленьня абвінавачваньня**

У выключных выпадках мера стрыманьня можа быць прыменена ў дачыненьні да асобы, падазраванай у зьдзяйсьненьні злачынства, і да прад'яўленьня ёй абвінавачваньня. У гэтым выпадку абвінавачваньне павінна быць прад'яўленае не пазьней дзесяці судняў з моманту прымяненьня меры стрыманьня. Калі ў гэты тэрмін абвінавачваньне ня будзе прад'яўленае, мера стрыманьня адмяняецца. Асоба, заключаная пад варту да прад'яўленьня ёй абвінавачваньня, мае права: абскардзіць дзеяньні асобы, якая праводзіла дазнаньне, сьледчага ці пракурора, даваць тлумачэньні і хадайнічаць, абскарджваць у судзе арышт, знаёміцца з матэрыяламі, якія накіроўваюцца ў суд, удзельнічаць пры разглядзе скаргі судзьдзём.

*Артыкул 86.* **Абставіны, якія ўлічваюцца пры выбраньні меры стрыманьня**

Пры вырашэньні пытаньня аб неабходнасьці прымяніць меру стрыманьня, а таксама аб выбраньні той альбо іншай зь іх, асоба, якая праводзіць дазнаньне, сьледчы, пракурор і суд (судзьдзя) улічваюць, акрамя абставінаў, указаных у артыкуле 84 дадзенага Кодэксу, таксама цяжкасьць зьдзейсьненага злачынства, асобу падазраванага альбо абвінавачванага, род яе заняткаў, узрост, стан здароўя, сямейнае становішча і іншыя абставіны.

*Артыкул 87.* **Пастанова і вызначэньне аб прымяненьні меры стрыманьня**

Аб прымяненьні меры стрыманьня асоба, якая праводзіць дазнаньне, сьледчы, пракурор выносіць матываваную пастанову, а суд - матываванае вызначэньне, якое ўтрымлівае ўказаньне на злачынства, у якім падазраецца альбо абвінавачваецца дадзеная асоба, і падставу для выбраньня



vytoki.net

прыменены меры стрыманьня. Пастанова аб'яўляюцца асобе, у дачыненьні да якой яны вынесеныя. Копія пастановы аб прымяненьні меры стрыманьня ў выглядзе арышту альбо аб працягу тэрміну ўтрыманьня пад вартай уручаюцца асобе, у дачыненьні да якой яны вынесеныя, і адначасова ёй тлумачыцца парадак абскарджаньня пастановы.

*Артыкул 88.* **Падпіска аб нявыезьдзе**

Падпіска аб нявыезьдзе заключаецца ў тым, што падазраваны альбо абвінавачваны ня мае права пакідаць месца жыхарства без дазволу асобы, якая праводзіць дазнаньне, сьледчага, пракурора і суду. У выпадку парушэньня падазраваным альбо абвінавачваным дадзенай ім падпіскі можа быць прыменена больш строгая мера стрыманьня, аб чым яму павінна быць паведамлена пры атрыманьні падпіскі аб нявыезьдзе.

*Артыкул 89.* **Асабістае паручыцельства**

Асабістае паручыцельства заключаецца ў прыняцьці на сябе заслугоўваючымі даверу асобамі пісьмовага абавязацельства ў тым, што яны паручаюцца за тое, што падазраваны альбо абвінавачваны, знаходзячыся на свабодзе, не схаваецца ад сьледзтва і суду, ня будзе перашкаджаць устанаўленьню праўды па крымінальнай справе і ня будзе займацца злачыннай дзейнасьцю. Колькасьць паручыцеляў ня можа быць менш двух чалавек. Пры падпісцы аб асабістым паручыцельстве паручыцель павінен быць пастаўлены ў вядомасьць аб сутнасьці справы, па якой выбраная дадзеная мера стрыманьня, і аб адказнасьці ў выпадку зьдзяйсьненьня падазраваным альбо абвінавачваным дзеяньняў, для папярэджаньня якіх была прыменена такая мера стрыманьня, як асабістае паручыцельства. У гэтым выпадку на кожнага паручыцеля можа быць накладзена судом грашовае спагнаньне ў памеры да ста рублёў* у парадку, прадугледжаным артыкулам 267 гэтага Кодэксу, альбо прыменены меры грамадзкіх узьдзеяньняў. * Памер грашовага спагнаньня, указанага ў артыкуле, не зьмяняўся і ня быў вызначаны ў залежнасьці ад узроўню мінімальнай зарплаты, устаноўленай у Рэспубліцы Беларусь.

*Артыкул 90.* **Паручыцельства грамадзкай арганізацыі альбо працоўнага калектыву**

Паручыцельства грамадзкай арганізацыі альбо працоўнага



калектыву заключаецца ў дачы пісьмовага абавязацельства ў тым, што грамадзкая арганізацыя альбо працоўны калектыў ручаюцца за паводзіны і яўку падазраванага альбо абвінавачванага па выкліках асобы, якая праводзіць дазнаньне, сьледчага, пракурора і суду. Грамадзкая арганізацыя альбо працоўны калектыў, якія даюць паручыцельства, павінны быць пастаўленыя ў вядомасьць аб сутнасьці справы, па якой выбраная дадзеная мера стрыманьня.

*Артыкул 91.* **Заключэньне пад варту**

Заключэньне пад варту ў якасьці меры стрыманьня прымяняецца ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі Палажэньня аб папярэднім заключэньні пад варту ў Рэспубліцы Беларусь і артыкулам 7 дадзенага Кодэксу па справах аб злачынствах, за якія законам прадугледжана пакараньне ў выглядзе пазбаўленьня волі на тэрмін больш аднаго году. У выключных выпадках гэтая мера стрыманьня можа быць прыменена па справах аб злачынствах, за якія законам прадугледжана пакараньне ў выглядзе пазбаўленьня волі і на тэрмін ня звыш аднаго году.

*Артыкул 94.* **Паведамленьне аб заключэньні абвінавачванага пад варту**

Аб выбраньні ў якасьці меры стрыманьня заключэньня пад варту, асоба, якая праводзіць дазнаньне, сьледчы, пракурор і суд паведамляюць па месцы працы і сям'і абвінавачванага. Копія пастановы аб заключэньні пад варту дасылаецца ў месца заключэньня.

*Артыкул 99.* **Абавязковае вядзеньне пратаколу**

Пры вытворчасьці сьледчых дзеяньняў, разглядзе судзьдзямі скаргаў на арышт і працяг тэрмінаў утрыманьня пад вартай, а таксама і судовых паседжаньнях судоў першай інстанцыі вядуцца пратаколы. Пратакол можа быць напісаны ад рукі альбо надрукаваны на машынцы. Для забесьпячэньня паўнаты пратаколу можа быць прыменена стэнаграфаваньне. Стэнаграфічны запіс да справы не дадаецца. Пратакол павінен утрымліваць указаньне на месца і дату вытворчасьці працэсуальнага дзеяньня з абазначэньнем часу ягонага пачатку і канца і на асобаў, якія прымалі ўдзел у ягонай вытворчасьці. У пратаколе выкладаюцца працэсуальныя дзеяньні ў тым парадку, у якім яны мелі месца, выяўленыя





vytoki.net

пры іхнай вытворчасьці істотныя для справы абставіны, а таксама заявы асобаў, якія ўдзельнічалі ў гэтых дзеяньнях. Пратакол падпісваецца асобамі, указанымі ў адпаведных артыкулах разгляданага Кодэксу. Усе ўнесеныя ў пратакол зьмены, дадаткі і выпраўленьні павінны быць агавораныя і пацьверджаныя подпісамі гэтых асобаў.

*Артыкул 119.* **Затрыманьне падазраванага ў зьдзяйсьненьні злачынства**

Орган дазнаньня мае права затрымаць асобу, падазраваную ў зьдзяйсьненьні злачынства, за якое можа быць прызначанае пакараньне ў выглядзе пазбаўленьня волі, толькі пры наяўнасьці адной з наступных падставаў: а) калі гэтая асоба засьпетая пры зьдзяйсьненьні злачынства ці непасрэдна пасьля яго зьдзяйсьненьня; б) калі сьведкі, у тым ліку і пацярпелыя, прама ўкажуць на дадзеную асобу, як на тую, што зьдзейсьніла злачынства; в) калі на падазраваным, на ягоным адзеньні ці ў ягоным жытле будуць знойдзены сьляды злачынства. Пры наяўнасьці іншых дадзеных, даючых падставы падазраваць асобу ў зьдзяйсьненьні злачынства, яна можа быць затрыманая толькі ў тым выпадку, калі спрабавала зьбегчы, калі ня мела пастаяннага месца жыхарства ці калі не ўстаноўленая асоба падазраванага. Асоба, затрыманая па падазрэньні ў зьдзяйсьненьні злачынства, мае права абскардзіць дзеяньні асобы, якая праводзіць дазнаньне, сьледчага ці пракурора, даваць тлумачэньні і хадайнічаць. У любым выпадку затрыманьня асобы, падазраванай у зьдзяйсьненьні злачынства, орган дазнаньня абавязаны скласьці пратакол з указаньнем падставаў, матываў, дня і гадзіны, году і месяца, месца затрыманьня, тлумачэньняў затрыманага, часу складаньня пратаколу і напрацягу дваццаці чатырох гадзінаў зрабіць пісьмовае паведамленьне пракурору. Пратакол затрыманьня падпісваецца асобай, якая яго склала, і затрыманым. Напрацягу сарака васьмі гадзінаў з моманту атрыманьня паведамленьня аб затрыманьні пракурор абавязаны даць санкцыю на заключэньне пад варту альбо вызваліць затрыманага. Аб вызваленьні затрыманага органам дазнаньня выносіцца пастанова, у якой выкладаецца падстава для вызваленьня. Органы дазнаньня і папярэдняга сьледзтва прымяняюць затрыманьне і пры адсутнасьці падставаў, указаных у артыкуле. Гэтае парушэньне неабходна неадкладна абскардзіць у пракурора згодна з арт. 218 КПК. Скаргу трэба перадаць сьледчаму. Ён абавязаны напрацягу судняў



перадаць яе пракурору. Пракурор абавязаны яе разгледзець напрацягу 3 судняў. Тэрмін затрыманьня да прад'яўленьня абвінавачваньня альбо да прымяненьня меры стрыманьня ў выглядзе заключэньня пад варту без прад'яўленьня абвінавачваньня таксама 3 судняў, такім чынам абскарджаньне носіць хутчэй сымбалічны характар. Пракуратура як правіла заплюшчвае вочы на парушэньне арт. 119.

*Артыкул 120.* **Выклік і допыт падазраванага**

Выклік і допыт падазраванага праводзіцца з выкананьнем правілаў, устаноўленых артыкуламі 144-146 і 149-153 гэтага Кодэксу. Калі падазраваны быў затрыманы альбо ў дачыненьні да яго выбраная мера стрыманьня ў выглядзе заключэньня пад варту, ягоны допыт праводзіцца неадкладна. Аднак, калі правесьці допыт неадкладна не прадстаўляецца магчымым, падазраваны павінен быць дапытаны не пазьней дваццаці чатырох гадзінаў з моманту затрыманьня.

*Артыкул 122.* **Органы папярэдняга сьледзтва**

Папярэдняе сьледзтва па крымінальных справах праводзіцца сьледчым пракуратуры, а таксама сьледчымі органаў унутраных справаў і сьледчымі органаў дзяржаўнай бясьпекі.

*Артыкул 132.* **Удзел панятых**

Пры даглядзе,ператрусе, выманьні, аглядзе, а таксама іншых сьледчых дзеяньнях, у выпадках, прадугледжаных дадзеным Кодэксам, выклікаюцца панятыя. Панятыя выклікаюцца ў колькасьці ня менш двух. У якасьці панятых могуць быць выкліканыя незацікаўленыя ў справе грамадзяне. Перад пачаткам сьледчага дзеяньня, у якім удзельнічаюць панятыя, сьледчы тлумачыць ім правы і абавязкі. Паняты абавязаны засьведчыць факт, зьмест і вынікі дзеяньняў, пры якіх ён прысутнічаў. Паняты мае права рабіць заўвагі па дадзеных дзеяньнях. Заўвагі панятога падлягаюць занясенью ў пратакол адпаведнага сьледчага дзеяньня.

*Артыкул 138.* **Пратакол сьледчага дзеяньня**

Пратакол аб сьледчым дзеяньні складаецца па ходзе сьледчага дзеяньня ці непасрэдна пасьля ягонага сканчэньня сьледчым. У пратаколе ўказваецца: месца і дата сьледчага дзеяньня, час ягонага пачатку і канца, пасада і прозьвішча





vytoki.net

асобы, якая склала пратакол, прозьвішча, імя і імя па бацьку кожнай асобы, якая ўдзельнічала ў сьледчым дзеяньні, а ў неабходных выпадках ейнае месца працы і адрас, зьмест сьледчага дзеяньня і высьветленыя пры ягонай вытворчасьці важныя для справы абставіны. Калі пры сьледчым дзеяньні прымянялася фатаграфаваньне, кіназдымка, гуказапіс альбо былі выробленыя зьлепкі і адбіткі сьлядоў, то ў пратаколе павінны быць таксама ўказаныя тэхнічныя сродкі, якія прымяняліся пры адпаведным сьледчым дзеяньні, умовы і парадак іхнага выкарыстаньня, аб'екты, да якіх яны былі прымененыя, і атрыманыя вынікі. У пратаколе павінна быць адзначана, што перад прымяненьнем тэхнічных сродкаў аб гэтым былі папярэджаныя асобы, якія ўдзельнічаюць ў сьледчым дзеяньні. Пратакол зачытваецца ўсім асобам, якія ўдзельнічаюць у сьледчым дзеяньні, прычым павінна быць патлумачана права рабіць заўвагі, якія трэба ўносіць у пратакол. Пратакол падпісваецца сьледчым, допытанай асобай, перакладчыкам, спэцыялістам, панятымі і іншымі асобамі, калі яны ўдзельнічаюць ў сьледчым дзеяньні. Да пратаколу дадаюцца фатаграфічныя нэгатывы і здымкі, кінастужкі, дыяпазытывы, фанаграмы допыту, пляны, схемы, зьлепкі і адбіткі сьлядоў, выкананыя пры сьледчых дзеяньнях.

*Артыкул 138.* **Прымяненьне гуказапісу пры допыце**

Па рашэньні сьледчага пры допыце абвінавачванага, падазраванага, сьведкі ці пацярпелага можа быць прыменены гуказапіс. Гуказапіс можа быць прыменены таксама па просьбе абвінавачванага, падазраванага, сьведкі альбо пацярпелага. Сьледчы прымае рашэньне аб гуказапісу і паведамляе пра гэта допытванаму да пачатку допыту. Гуказапіс павінен выявіць зьвесткі, указаныя ў частцы другой артыкулу 138 гэтага Кодэксу, і паўплываюць на ўсю ходу допыту. Гуказапіс частцы допыту, а таксама паўтарэньне спэцыяльна для гуказапісу паказаньняў, дадзеных у ходзе таго самага допыту, не дапускаюцца. Па сканчэньні допыту гуказапіс цалкам узнаўляецца для допытванага. Дадаткі да гуказапісу паказаньняў, зробленыя допытваным, таксама заносяцца на фанаграму. Гуказапіс заканчваецца заявай допытванага, якая пацьвярджае яго правільнасьць. Паказаньні, атрыманыя ў ходзе допыту з прымяненьнем гуказапісу, заносяцца ў пратакол допыту ў адпаведнасьці з правіламі разгляданага Кодэксу. Пратакол допыту павінен таксама ўтрымліваць: адзнаку аб прымяненьні гуказапісу і





паведамленьні аб гэтым допытванага; зьвесткі аб тэхнічных сродках і ўмовах гуказапісу; заявы допытванага па пытаньні прымяненьня гуказапісу; адзнаку аб узнаўленьні гуказапісу для допытванага; пацьвярджэньні правільнасьці пратаколу і гуказапісу допытваным і сьледчым. Фанаграма захоўваецца пры справе і па сканчэньні папярэдняга сьледзтва апячатваваецца. У выпадку ўзнаўленьня гуказапісу пры сьледчым дзеяньні сьледчы абавязаны зрабіць аб гэтым адзнаку ў пратаколе адпаведнага сьледчага дезяньня.

*Артыкул 139.* **Засьведчаньне факту адмовы ад падпісаньня альбо немагчымасьці падпісаньня пратаколу сьледчага дзеяньня**

Калі абвінавачваны, падазраваны, сьведка альбо іншая асоба адмовіцца падпісаць пратакол сьледчага дзеяньня, аб гэтым робіцца адзнака ў пратаколе, завераная подпісам асобы, якая праводзіла сьледчае дзеяньне. Таму, хто адмовіўся падпісаць пратакол, павінна быць прадстаўленая магчымасьць патлумачыць прычыны адмовы, што і заносіцца ў пратакол. Калі адна з асобаў, указаных у частцы першай дадзенага артыкулу, у сілу фізычных недахопаў пазбаўленая магчымасьці падпісаць пратакол сьледчага дзеяньня, аб гэтым робіцца адзнака ў пратаколе, завераная подпісам сьледчага і панятых. Калі абвінавачваны, падазраваны, сьведка і пацярпелы ня могуць па гэтай самай прычыне падпісаць пратакол допыту, сьледчы запрашае пабочную асобу, якая са згоды допытванай асобы пацьвярджае сваім подпісам правільнасьць запісу ягоных паказаньняў. Гэты пратакол падпісвае і сьледчы, які праводзіў допыт.

*Артыкул 141.* **Недапушчальнасьць разгалошаньня дадзеных папярэдняга сьледзтва**

Дадзеныя папярэдняга сьледзтва могуць быць разгалошаныя толькі з дазволу сьледчага ці пракурора і ў тым аб'ёме, у якім яны прызнаюць гэта магчымым. У неабходных выпадках сьледчы папярэджвае сьведкаў, пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, абаронцу, экспэрта, спэцыяліста, перакладчыка, панятых і іншых асобаў, прысутных пры сьледчых дзеяньнях, аб недапушчальнасьці разгалошаньня безь ягонага дазволу дадзеных папярэдняга сьледзтва. Ад указаных асобаў бярэцца падпіска з папярэджаньнем аб адказнасьці па артыкуле 180 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь.



vytoki.net

*Артыкул 142.* **Прыцягненьне ў якасьці абвінавачванага**

Пры наяўнасьці дастатковых доказаў, якія даюць падставу для прад'яўленьня абвінавачваньня ў зьдзяйсьненьні злачынства, сьледчы выносіць матываваную пастанову аб прыцягненьні асобы ў якасьці абвінавачванага.

*Артыкул 143.* **Пастанова аб прыцягненьні ў якасьці абвінавачванага**

У пастанове аб прыцягненьні ў якасьці абвінавачванага павінна быць указана: час і месца яе складаньня; кім складзеная пастанова; прозьвішча, імя, імя па бацьку і ўзрост прыцягнутага ў якасьці абвінавачванага; злачынства, у зьдзяйсьненьні якога абвінавачваецца дадзеная асоба, з указаньнем часу, месца і іншых абставінаў зьдзяйсьненьня злачынства, паколькі яны ўстаноўленыя матэрыяламі справы; крымінальны закон, які прадугледжвае дадзенае злачынства. Калі абвінавачваны падазраецца ў зьдзяйсьненьні некалькіх злачынстваў, падпадаючых пад дзеяньне розных артыкулаў крымінальнага закону, у пастанове аб прыцягненьні ў якасьці абвінавачванага павінна быць указана, якія канкрэтныя дзеяньні ставяцца ў віну абвінавачванаму па кожным з артыкулаў крымінальнага закону.

*Артыкул 144.* **Парадак выкліку абвінавачванага**

Абвінавачваны, які знаходзіцца на волі, выклікаецца да сьледчага павесткай, якая ўручаецца абвінавачванаму пад расьпіску з указаньнем часу ўручэньня. Павестка можа быць перададзеная таксама тэлефанаграмай альбо тэлеграмай. У павестцы павінна быць указана, хто выклікаецца ў якасьці абвінавачванага, куды і да каго, дзень і час яўкі, а таксама наступствы няяўкі. У выпадку часовай адсутнасьці абвінавачванага павестка для перадачы яму ўручаецца пад расьпіску каму-небудзь з сумесна зь ім пражываючых дарослых чальцоў сям'і, жыльлёва-эксплюатацыйнай арганізацыі ці адміністрацыі па месцы ягонай працы. Абвінавачваны, які знаходзіцца пад вартай, выклікаецца праз адміністрацыю месца заключэньня.

*Артыкул 145.* **Абавязковасьць яўкі абвінавачванага**

Абвінавачваны абавязаны зьявіцца па выкліку сьледчага ў прызначаны тэрмін. Уважлівымі прычынамі няяўкі



абвінавачванага прызнаюцца: - хвароба, якая пазбаўляе абвінавачванага магчымасьці зьявіцца; - несваечасовасьць атрыманьня абвінавачваным павесткі; - іншыя заслугоўваючыя ўвагі абставіны.

*Артыкул 146.* **Прывод абвінавачванага**

У выпадкуе няяўкі без уважлівай прычыны абвінавачваны можа быць паддадзены прымусоваму прыводу. Прывод абвінавачванага без папярэдняга выкліку можа быць прыменены толькі ў тых выпадках, калі абвінавачваны ўхіляецца ад сьледзтва альбо ня мае пэўнага месца жыхарства. Прывод абвінавачванага, апрача выпадкаў, якія патрабуюць неадкладнага вырашэньня, не дапускаецца ў начны час. Аб прыводзе сьледчы складае пастанову, якая аб'яўляецца абвінавачванаму. Прывод па даручэньні сьледчага робіцца органамі міліцыі.

*Артыкул 147.* **Прад'яўленьне абвінавачваньня**

Прад'яўленьне абвінавачваньня павінна працягвацца не пазьней двух судняў з моманту вынясеньня пастановы аб прыцягненьні абвінавачванага, а ў выпадку прыводу – у дзень прыводу. Абвінавачваньне можа быць прад'яўлена пасьля двух судняў у выпадках, калі не вядомае месца перабываньня абвінавачванага ці калі ён не зьявіўся па выкліку сьледчага. Сьледчы, пераканаўшыся ў асобе абвінавачванага, аб'яўляе яму пастанову аб прыцягненьні ў якасьці абвінавачванага і тлумачыць сутнасьць прад'яўленага абвінавачваньня. Выкананьне гэтых дзеяньняў пацьвярджаецца подпісамі абвінавачванага і сьледчага на пастанове аб прыцягненьні ў якасьці абвінавачванага з указаньнем часу прад'яўленьня абвінавачваньня. У выпадку адмовы абвінавачванага ад подпісу сьледчы пацьвярджае на пастанове аб прыцягненьні ў якасьці абвінавачванага, што абвінавачванаму тэкст пастановы аб'яўлены.

*Артыкул 148.* **Тлумачэньне абвінавачванаму ягоных правоў на папярэднім сьледзтве**

Пры прад'яўленьні абвінавачваньня сьледчы абавязаны патлумачыць абвінавачванаму ягоныя правы, прадугледжаныя артыкулам 48 гэтага Кодэксу, аб чым робіцца адзнака на постанове аб прыцягненьні ў якасьці абвінавачванага, якая пацьвярджаецца подпісам абвінавачванага.





vytoki.net

*Артыкул 149.* **Парадак допыту абвінавачванага**

Сьледчы абавязаны дапытаць абвінавачванага адразу пасьля прад'яўленьня яму абвінавачваньня. Допыт абвінавачванага не дапускаецца ў начны час, апрача выпадкаў, якія патрабуюць неадкладнага вырашэньня. Абвінавачваны дапытваецца ў месцы папярэдняга сьледзтва. Сьледчы мае права, калі прызнае гэта неабходным, правесьці допыт у месцы знаходжаньня абвінавачванага. Абвінавачваныя, выкліканыя па адной, дапытваюцца асобна, прычым сьледчы прымае меры, каб яны не маглі памаўляцца міжсобку. Напачатку допыту сьледчы павінен спытаць абвінавачванага, ці прызнае ён сябе вінoўным у прад'яўленым яму абвінавачваньні, пасьля чаго прапаноўвае абвінавачванаму даць паказаньні па сутнасьці абвінавачваньня. Сьледчы выслухоўвае паказаньні абвінавачванага, а затым, у выпадку неабходнасьці, задае абвінавачванаму пытаньні. Першы і наступны допыты ў якасьці абвінавачванага робяцца толькі ў прысутнасьці абаронцы, за выключэньнем выпадку адмовы ад любых (не канкрэтных) абаронцаў увогуле.

*Артыкул 152.* **Пратакол допыту абвінавачванага**

Аб кожным допыце абвінавачванага сьледчы складае пратакол з выкананьнем патрабаваньняў артыкулаў 138 і 139 дадзенага Кодэксу. У пратаколе допыту ўказваюцца дадзеныя аб асобе абвінавачванага, у тым ліку: прозьвішча, імя, імя па бацьку, час і месца нараджэньня, грамадзянства, нацыянальнасьць, адукацыя, сямейнае становішча, месца працы, род заняткаў ці пасада, месца жыхарства, былая суджонасьць, а таксама і іншыя зьвесткі, якія акажуцца неабходнымі па абставінах справы. Паказаньні абвінавачванага заносяцца ў пратакол у першай асобе і па магчымасьці даслоўна; у выпадку неабходнасьці запісваюцца зададзеныя абвінавачванаму пытаньні і ягоныя адказы. Па сканчэньні допыту пратакол прад'яўляецца абвінавачванаму для прачытаньня ці па ягонай просьбе прачытваецца сьледчым. Абвінавачваны мае права патрабаваць дапаўненьня пратаколу і ўнясеньня ў яго паправак. Гэтыя дапаўненьні і папраўкі падлягаюць абавязковаму занясеньню ў пратакол. Пасьля прачытаньня пратаколу абвінавачваны сваім подпісам пацьвярджае правільнасьць запісу ягоных паказаньняў. Перад подпісам абвінавачванага ў пратаколе адзначаецца, ці прачытаў пратакол сам абвінавачваны, ці ён





яму быў прачытаны сьледчым. Калі пратакол напісаны на некалькіх старонках, абвінавачваны падпісвае кожную старонку асобна. Усе дапаўненьні і папраўкі ў пратаколе павінны быць пацьверджаныя подпісам абвінавачванага і сьледчага. Калі допыт абвінавачванага праходзіць з удзелам перакладчыка, то пратакол допыту павінен уключаць указаньне на тлумачэньне перакладчыку ягоных абавязкаў і папярэджаньне аб адказнасьці за няправільны пераклад, што пацьвярджаецца подпісам перакладчыка. У пратаколе таксама адзначаюцца тлумачэньне абвінавачванаму ягонага права на адвод перакладчыка і заява абвінавачванага, якая паступіла ў сувязі з гэтым. Перакладчык падпісвае кожную старонку пратаколу і пратакол у цэлым. Абвінавачваны сваім подпісам у канцы пратаколу пацьвярджае, што зроблены яму ў вуснай форме пераклад пратаколу адпавядае дадзеным ім паказаньням. Калі пратакол допыту быў перакладзены на іншую мову ў пісьмовым выглядзе, то пераклад у цэлым і кожная ягоная старонка паівнны быць падпісаныя перакладчыкам і абвінавачваным.

*Артыкул 153.* **Уласнаручны запіс абвінавачваным сваіх паказаньняў**

Пасьля дачы абвінавачваным паказаньняў, у выпадку ягонай просьбы, яму павінна быць прадстаўленая магчымасьць напісаць свае паказаньні ўласнаручна, аб чым робіцца адзнака ў пратаколе допыту. Паказаньні падпісваюцца абвінавачваным і сьледчым. Сьледчы пасьля азнаямленьня зь пісьмовымі паказаньнямі абвінавачванага можа задаць яму дадатковыя пытаньні. Гэтыя пытаньні і адказы на іх уносяцца ў пратакол. Правільнасьць запісаў пытаньняў і адказаў зацьвярджаецца подпісамі абвінавачванага і сьледчага.

*Артыкул 156.* **Парадак выкліку сьведкі**

Сьведка выклікаецца да сьледчага павесткай, якая ўручаецца пад расьпіску сьведку, а ў выпадку ягонай часовай адсутнасьці - каму-небудзь з дарослых чальцоў сям'і альбо жыльлёва-эксплюатацыйнай арганізацыі, адміністрацыі па месцы працы сьведкі. У павестцы павінна быць указана: хто выклікаецца ў якасьці сьведкі, куды і да каго, дзень і час яўкі, а таксама наступствы няяўкі. Сьведка можа быць выкліканы таксама тэлефанаграмай ці тэлеграмай. Выклік у якасьці сьведкі асобы, якая не дасягнула шаснаццацігадовага ўзросту,



vytoki.net

робіцца празь ягоных сваякоў ці іншых законных прадстаўнікоў. Іншы парадак дапускаецца толькі ў выпадку, калі гэтага вымагаюць абставіны справы.

*Артыкул 157.* **Месца допыту сьведкі**

Сьведка дапытваецца ў месцы правядзеньня сьледзтва. Сьледчы мае права, калі прызнае гэта неабходным, правесьці допыт у месцы знаходжаньня сьведкі.

*Артыкул 158.* **Парадак допыту сьведкі**

Сьведкі, выкліканыя па адной справе, дапытваюцца асобна і ў адсутнасьць іншых сьведкаў. Пры гэтым сьледчы прымае меры, каб яны не маглі памаўляцца міжсобку. Перад допытам сьледчы запэўніваецца ў асобе сьведкі, тлумачыць яму ягоныя абавязкі і папярэджвае аб адказнасьці за ўхіленьне ад яўкі да асобы, якая праводзіць дазнаньне, сьледчага, пракурора ці ў суд, за адмову ад дачы паказаньняў альбо за дачу ілжывых паказаньняў, аб чым робіцца адзнака ў пратаколе, якая пацьвярджаецца подпісам сьведкі. Сьведкам, якія не дасягнулі шаснаццацігадовага ўзросту, сьледчы тлумачыць абавязак праўдзіва распавесьці ўсё вядомае ім па справе, але яны не папярэджваюцца аб адказнасьці за ўхіленьне ад яўкі да асобы, якая праводзіць дазнаньне, сьледчага, пракурора альбо ў суд, за адмову ад дачы паказаньняў ці за дачу ілжывых паказаньняў. Напачатку допыту сьледчы высьвятляе адносіны сьведкі да абвінавачванага і пацярпелага і іншыя неабходныя зьвесткі аб асобе дапытванага. Допыт пачынаецца прапановай сьведку распавесьці ўсё вядомае яму аб абставінах, у сувязі зь якімі ён выкліканы на допыт; пасьля аповеду сьведкі сьледчы можа задаць яму пытаньні. Навадныя пытаньні не дапускаюцца.

*Артыкул 160.* **Пратакол допыту сьведкі**

Аб допыце сьведкі складаецца пратакол з выкананьнем патрабаваньняў артыкулаў 138, 139 і 159 гэтага Кодэксу. Паказаньні сьведкі заносяцца ў пратакол у першай асобе і па магчымасьці даслоўна; у выпадку неабходнасьці запісваюцца зададзеныя сьведку пытаньні і ягоныя адказы на іх. Па сканчэньні допыту пратакол прад'яўляецца сьведку для прачытаньня ці па ягонай просьбе прачытваецца сьледчым. Сьведка мае права патрабаваць дапаўненьня пратаколу і ўнясеньня ў яго папраўак. Гэтыя дапаўненьні і папраўкі падлягаюць абавязковаму занясеньню ў пратакол. Пасьля





прачытаньня пратаколу сьведка сваім подпісам пацьвярджае правільнасьць запісу яго паказаньняў. Перад подпісам сьведкі ў пратаколе адзначаецца, ці прачытау пратакол сьведка, ці ён яму быў прачытаны сьледчым. Калі пратакол напісаны на некалькіх старонках, сьведка падпісвае кожную старонку асобна. Усе дапаўненьні і папраўкі ў пратаколе павінны быць пацьверджаныя подпісам сьведкі і сьледчага. У выпадку, калі допыт праводзіўся з удзелам перакладчыка, пратакол допыту складаецца з выкананьнем правілаў, устаноўленых артыкулам 152 дадзенага Кодэксу.

*Артыкул 162.* **Парадак вочнай стаўкі**

Сьледчы мае права правесьці вочную стаўку між дзьвюма раней дапытванымі асобамі, у паказаньнях якіх маюцца істотныя супярэчнасьці. Калі вочная стаўка праводзіцца з удзелам сьведкі і пацярпелага, яны да пачатку допыту папярэджвацца аб адказнасьці за адмову ці ўхіленьне ад дачы паказаньняў і за дачу ілжывых паказаньняў, што адзначаецца ў пратаколе. Прыступаючы да допыту на вочной стаўцы, сьледчы апытвае асобаў, між якімі робіцца вочная стаўка, ці ведаюць яны адзін аднаго і ў якіх дачыненьнях знаходзяцца міжсобку. Затым указаным асобам прапаноўваецца даць паказаньні па тых абставінах, для высьвятленьня якіх праводзіцца вочная стаўка. Пасьля дачы паказаньняў кожнаму з дапытваных сьледчы можа задаваць пытаньні. Асобы, між якімі праводзілася вочная стаўка, могуць з дазволу сьледчага задаваць пытаньні адна адной, аб чым адзначаецца ў пратаколе. Агалошваньне паказаньняў удзельнікаў вочнай стаўкі, якія ўтрымліваюцца ў пратаколах папярэдніх допытаў, а таксама ўзнаўленьне гуказапісу гэтых паказаньняў дапускаецца толькі пасьля дачы імі паказаньняў на вочнай стаўцы і запісу іх у пратакол. У пратаколе вочнай стаўкі паказаньні дапытваных асобаў запісваюцца ў той чарзе, у якой яны даваліся. Кожны ўдзельнік вочнай стаўкі падпісвае свае паказаньні і кожную старонку асобна

*Артыкул 218.* **Парадак абскарджаньня**

Скаргі на дзеяньні органаў дазнаньня ці сьледчага падаюцца пракурору непасрэдна альбо праз асобу, якая праводзіць дазнаньне, ці сьледчага. Скаргі могуць быць як пісьмовыя, так і вусныя. Вусныя скаргі заносяцца у пратакол, які падпісваецца заяўнікам і асобай, якая прыняла скаргу Асоба, якая праводзіць дазнаньне, і сьледчы абавязаныя напрацягу дваццаці чатырох гадзінаў накіраваць скаргу разам



vytoki.net

са сваімі тлумачэньнямі пракурору. У пэрыяд ад прынясеньня скаргі да ейнага вырашэньня не прыпыняецца выкананьне дзеяньня, якое абскарджваецца, калі гэтага ня зробяць адпаведна асоба, якая праводзіць дазнаньне, сьледчы ці пракурор.

*Артыкул 219.* **Разгляд скаргі пракурорам**

Пракурор напрацягу трох судняў пасьля атрыманьня скаргі абавязаны разгледзець яе і паведаміць заяўніку аб выніках разгляду. У выпадку адмовы пракурор абавязаны выкласьці матывы, па якіх скарга прызнаная беспадстаўнай. Скарга і копія паведамленьня аб выніках ейнага вырашэньня дадаецца да крымінальнай справы.

*Артыкул 220.* **Абскарджаньне дзеяньняў і рашэньняў пракурора**

Скаргі на дзеяньні і рашэньні пракурора прыносяцца вышэйстаячаму пракурору.

*Артыкул 92.* **Тэрміны ўтрыманьня пад вартай**

Утрыманьне пад вартай пры расьсьледаваньні злачынстваў па крымінальных справах ня можа працягвацца больш двух месяцаў. Гэты тэрмін можа быць працягнуты раённым, гарадзкім пракурорам, ваенным пракурорам гарнізону і прыроўненым да іх пракурорам у выпадку немагчымасьці скончыць расьсьледаваньне і пры адсутнасьці падставаў для зьмены меры стрыманьня - да трох месяцаў. Далейшы працяг тэрміну можа быць зьдзейсьнены толькі па прычыне асаблівай складанасьці справы пракурорам вобласьці, гораду Менску і прыроўненым да іх пракурорам - да шасьці месяцаў з дня ўзяцьця пад варту. Працяг тэрміну ўтрыманьня пад вартай звыш шасьці месяцаў дапускаецца ў выключных выпадках і толькі ў дачыненьні да асобаў, якія абвінавачваюцца ў зьдзяйсьненьні цяжкіх злачынстваў. Такі працяг зьдзяйсьняецца намесьнікам Генэральнага пракурора Рэспублікі Беларусь - да аднаго году і Генэральным пракурорам Рэспублікі Беларусь - да году з палавінай. Пытаньне аб утрыманьні абвінавачванага пад вартай на тэрмін больш аднаго году папярэдне разглядаецца на калегіі Пракуратуры Рэспублікі Беларусь. Далейшы працяг тэрміну не дапускаецца, абвінавачваны, які ўтрымліваецца пад вартай, падлягае неадкладнаму вызваленьню. Матэрыялы скончанага расьсьледаваньня крымінальнай справы павінны быць





прад'яўленыя для азнаямленьня абвінавачванаму і ягонаму абаронцу не пазьней чым за месяц да сканчэньня тэрміну ўтрыманьня пад вартай, устаноўленага часткай другой дадзенага артыкулу. Час азнаямленьня абвінавачванага і ягонага абаронцы з матэрыяламі крымінальнай справы пры сканчэньні тэрміну ўтрыманьня пад вартай у якасьці меры стрыманьня ня ўлічваецца. Пры вяртаньні судом на новае расьсьледаваньне справы, па якой тэрмін утрыманьня абвінавачванага пад вартай скончаны, а па абставінах справы мера стрыманьня ў выглядзе ўтрыманьня пад вартай зьменена ня можа быць, працяг тэрміну ўтрыманьня пад вартай праводзіцца пракурорам, які зьдзяйсьняе нагляд за сьледзтвам, у межах аднаго месяца з моманту паступленьня да яго справы. Далейшы працяг указанага тэрміну праводзіцца з улікам часу перабываньня абвінавачванага пад вартай да накіраваньня справы ў суд у парадку і межах, устаноўленых часткай першай дадзенага артыкулу. Пастанова аб працягу тэрміну ўтрыманьня пад вартай можа быць абскарджана ў судзе. Пры паўторным заключэньні пад варту той самай асобы па той самай справе пасьля адмены судзьдзём арышту тэрміны ўтрыманьня пад вартай, устаноўленыя дадзеным артыкулам, вылічаюцца з улікам часу перабываньня дадзенай асобы пад вартай да адмены арышта судзьдзём.

*Артыкул 220-2.* **Судовая праверка законнасьці заключэньня пад варту альбо працягу тэрміну ўтрыманьня пад вартай судом першай інстанцыі**

Судовая праверка законнасьці заключэньня асобы пад варту альбо працягу тэрміну ўтрыманьня пад вартай адбываецца напрацягу трох судняў з дня паступленьня скаргі судзьдзём па месцы расьсьледаваньня злачынства з абавязковым удзелам пракурора. Скаргі ў дачыненьні да адной і той жа асобы разглядаюцца ў адной вытворчасьці. Разгляд скаргі праводзіцца на закрытым судовым паседжаньні, у якім мае права прымаць удзел пацярпелы, законны прадстаўнік непаўналетняга пацярпелага, абаронца, законны прадстаўнік непаўналетняга, які ўтрымліваецца пад вартай. Няяўка ўказаных асобаў не перашкаджае разгляду скаргі. У неабходных выпадках для ўдзелу ў разглядзе скаргі судзьдзя мае права выклікаць на судовае паседжаньне асобу, якая ўтрымліваецца пад вартай. Напачатку судовага паседжаньня судзьдзя аб'яўляе, якая скарга разглядаецца,



vytoki.net

прадстаўляецца сам удзельнікам паседжаньня, прадстаўляе пракурора і сакратара судовага паседжаньня. Пасьля гэтага судзьдзя тлумачыць удзельнікам судовага паседжаньня іхныя правы і абавязкі і бярэ ад асобаў, указаных у частцы другой гэтага артыкулу, падпіску аб неразгалошваньні дадзеных расьследаваньня. Затым судзьдзя заслухоўвае асобу, якая падала скаргу, калі яна ўдзельнічае ў судовым паседжаньні, іншых асобаў, якія ўдзельнічаюць у судовым паседжаньні, і заключэньне пракурора. Па выніках судовай праверкі скаргі судзьдзя выносіць адну з наступных пастановаў: 1) у выпадку ўстанаўленьня парушэньня органам дазнаньня, сьледчым, пракурорам патрабаваньняў артыкулаў 91 і 92 гэтага Кодэксу, права падазраванага, абвінавачванага на абарону, неадпаведнасьці прад'яўленага абвінавачваньня зьместу пастановы аб выбраньні меры стрыманьня ў выглядзе заключэньня пад варту альбо аб працягу тэрміну ўтрыманьня пад вартай - аб адмене меры стрыманьня ў выглядзе ўтрыманьня пад вартай і вызваленьні асобы з-пад варты. Пры гэтым судзьдзя абавязаны выбраць у дачыненьні да асобы, вызваленай з-пад варты, адну зь іншых мераў стрыманьня, прадугледжаных дадзеным Кодэксам, і патлумачыць, што ў выпадку парушэньня выбранай ім меры стрыманьня асоба можа быць зноў заключаная пад варту; 2) аб пакіданьні скаргі без задавальненьня.

*Артыкул 220-3.* **Парадак апратэставаньня і абскарджаньня пастановы судзьдзі**

Пастанова судзьдзі першай інстанцыі аб вызваленьні асобы з-пад варты ўступае ў законную сілу па сканчэньні судняў з дня ейнага вынясеньня. Напрацягу гэтага тэрміну яна можа быць апратэставана пракурорам, а таксама абскарджана пацярпелым у вышэйстаячым судзе. Вынясеньне пратэсту ці падача скаргі прыпыняюць выкананьне пастановы судзьдзі. На пастанову судзьдзі суду першай інстанцыі аб пакіданьне скаргі без задавальненьня можа быць напрацягу судняў пададзеная скарга ў вышэйстаячы суд асобай, якая абскардзіла заключэньне пад варту ці працяг тэрміну ўтрыманьня пад вартай. У выпадку задавальненьня скаргі вышэйстаячы суд абавязаны выбраць у дачыненьні да асобы, якая вызваляецца з-пад варты, іншую меру стрыманьня ў парадку, прадугледжаным пунктам 1 часткі пятай артыкулу 220-2. Пратэсты і скаргі на пастанову судзьдзі суду першай інстанцыі падаюцца праз судзьдзю, які вынес пастанову.





Праца суду першай інстанцыі па праверцы законнасьці заключэньня пад варту ці працягу тэрміну ўтрыманьня пад вартай падлягае накіраваньню разам з пратэстам альбо скаргай у вышэйстаячы суд напрацягу судняў. Пратэсты і скаргі на пастановы судзьдзі разглядаюцца вышэйстаячым судом напрацягу трох судняў з дня іхнага паступленьня ў парадку, устаноўленым часткай другой артыкулу 220-2, з абавязковым удзелам пракурора. Рашэньне вышэйстаячага суду па пратэсьце альбо скарзе ўступае ў законную сілу неадкладна, зьяўляецца канчатковым, далейшаму абскарджаньню не падлягае, але можа быць апратэставана ў парадку нагляду ўпаўнаважанымі на тое асобамі, указанымі ў артыкуле 380 дадзенага Кодэксу. Пасьля ўступленьня пастановы судзьдзі ў законную сілу ягоная копія напрацягу судняў накіроўваецца асобе, якая падала скаргу, і пракурору, а ў выпадку прыняцьця рашэньня аб вызваленьні асобы з-пад варты - неадкладна адміністрацыі месца ўтрыманьня пад вартай для выкананьня. Паўторнае абскарджаньне заключэньня пад варту не дапускаецца. У выпадку пакіданьня без задавальненьня скаргі дапускаецца яе паўторная падача пры кожным новым працягу тэрміну ўтрыманьня пад вартай. Паўторнае прымяненьне меры стрыманьня ў выглядзе заключэньня пад варту пасьля яе адмены пастановай судзьдзі магчымае толькі ў выпадках парушэньня асобай, вызваленай з-пад варты, умоваў выбранай ёй судзьдзём меры стрыманьня, а таксама пры адкрыцьці новых абставінаў, якія даюць падставы для заключэньня асобы пад варту па новым абвінавачваньні.



vytoki.net

# КОДЭКС АБ АДМІНІСТРАЦЫЙНЫХ ПРАВАПАРУШЭНЬНЯХ

(вытрымкі і камэнтары да асобных артыкулаў)

*Артыкул 235.* **Зьмест пратаколу аб адміністрацыйным правапарушэньні**

У пратаколе аб адміністрацыйным правапарушэньні ўказваюцца: дата і месца ягонага складаньня; пасада, прозьвішча, імя, імя па бацьку асобы, што склала пратакол; зьвесткі аб асобе парушальніка; месца, час зьдзяйсьненьня і сутнасьць адміністрацыйнага правапарушэньня; нарматыўны акт, якія прадугледжвае адказнасьць за дадзенае правапарушэньне; прозьвішчы, адрасы сьведкаў і пацярпелых, калі яны маюцца; тлумачэньні парушальніка; іншыя зьвесткі, неабходныя для вырашэньня справы. Пратакол падпісваецца асобай, якая яго склала, і асобай, якая зьдзейсьніла адміністрацыйнае правапарушэньне; пры наяўнасьці сьведкаў і пацярпелых пратакол можа быць таксама падпісаны і гэтымі асобамі. У выпадку адмовы асобы, якая зьдзейсьніла правапарушэньне, ад падпісаньня пратаколу, у ім робіцца запіс аб гэтым. Асоба, якая зьдзейсьніла правапарушэньне, мае права прадставіць у дадатак да пратаколу тлумачэньні і заўвагі па зьмесьце пратаколу, а таксама выкласьці матывы сваёй адмовы ад ягонага падпісаньня. Асобе, якая зьдзейсьніла адміністрацыйнае мытнае правапарушэньне, копія пратаколу ўручаецца пад расьпіску альбо высылаецца поштай. Пры складаньні пратаколу парушальніку тлумачацца ягоныя правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 247 гэтага Кодэксу, аб чым робіцца адзнака ў пратаколе. Калі вы нязгодныя са зьместам пратаколу аб адміністрацыйным правапарушэньні, то лепей адмовіцца ад ягонага падпісаньня. Вам будуць прапаноўваць падпісаць пратакол, а сваю нязгоду зь ягоным зьместам зафіксаваць у графе «тлумачэньні правапарушальніка», але лепей увогуле адмовіцца ад подпісу, бо на вашыя тлумачэньні ніхто ня зьверне ўвагі, а адмова ад падпісаньня пратаколу ўяўляе для складальніка пратаколу пэўную праблему, апрача таго ў судзе ў вас абавязкова павінны спытаць прычыну адмовы ад падпісаньня пратаколу.



*Артыкул 240.* **Адміністрацыйнае затрыманьне**

Аб адміністрацыйным затрыманьні складаецца пратакол, у якім указваюцца: дата і месца ягонага складаньня; пасада, прозьвішча, імя і імя па бацьку асобы, якая склала пратакол; зьвесткі аб асобе затрыманага; час, месца і падставы затрыманьня. Пратакол падпісваецца службовай асобай, якая яго склала, і затрыманым. У выпадку адмовы затрыманага ад падпісаньня пратаколу ў ім робіцца запіс аб гэтым. Па просьбе асобы, затрыманай за зьдзяйсьненьне адміністрацыйнага правапарушэньня, аб месцы яе знаходжаньня паведамляецца ейным сваякам, адміністрацыі па месцы працы альбо вучобы. Аб затрыманьні непаўналетняга паведамляюць ягоным бацькам альбо асобам, якія іх замяняюць. Калі вы нязгодныя са зьместам пратаколу затрыманьня, то лепей адмовіцца ад ягонага падпісаньня. Вам будуць прапаноўваць падпісаць пратакол, а сваю нязгоду зь ягоным зьместам зафіксаваць асобна, але лепей увогуле адмовіцца ад подпісу, бо на вашыя тлумачэньні ніхто ня зьверне ўвагі, а адмова ад падпсіаньня пратаколу ўяўляе для складальніка пратаколу пэўную праблему. Спасылаючыся на арт.240 вы маеце права патрабаваць паведамленьня сваякам аб вашым месцазнаходжаньні. Вашае патрабаваньне абавязаныя выканаць асобы, якія зьдзяйсьнялі затрыманьне, альбо асоба, якая складала пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні.

*Артыкул 241.* **Органы (службовыя асобы), правамоцныя зьдзяйсьняць адміністрацыйнае затрыманьне**

Адміністрацыйнае затрыманьне асобы, якая зьдзейсьніла адміністрацыйнае правапарушэньне, можа праводзіцца толькі органамі (службовымі асобамі), упаўнаважанымі на гэта заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, а менавіта: 1) органамі ўнутраных справаў (міліцыі) - пры зьдзяйсьненьні дробнага хуліганства, злоснага непадпарадкаваньня законнаму распараджэньню альбо патрабаваньню супрацоўніка міліцыі, ваеннаслужачага, парушэньні парадку арганізацыі правядзеньня сходаў, мітынгаў, вулічных шэсьцяў і дэманстрацыяў, незаконных апэрацыях з замежнай валютай і плацёжнымі дакумэнтамі, незаконным продажы тавараў ці іншых прадметаў, дробнай спэкуляцыі, пры расьпіцьці спіртных напояў у грамадзкіх месцах ці зьяўленьні ў грамадзкіх месцах у п'яным выглядзе, які зьневажае чалавечую годнасьць і грамадзкую маральнасьць, парушэньні





vytoki.net

правілаў дарожнага руху, правілаў паляваньня, рыбнай лоўлі і аховы рыбных запасаў і іншых парушэньнях заканадаўства аб ахове і выкарыстаньні жывёльнага сьвету, у выпадках, калі маюцца падставы думаць, што асоба займаецца прастытуцыяй, а таксама ў іншых выпадках, прама прадугледжаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь; 2) памежнымі войскамі - пры парушэньні памежнага рэжыму альбо рэжыму ў пунктах пропуску праз дзяржаўную мяжу РБ; 3) службовай асобай у месцы разьмяшчэньня ахоўнага аб'екту ці аховай - пры зьдзяйсьненьні правапарушэньняў, зьвязаных з замахам на ахоўныя аб'екты, іншую дзяржаўную альбо грамадзкую маёмасьць; 4) службовымі асобамі ваеннай аўтамабільнай інспэкцыі - пры парушэньні кіроўцамі ці іншымі асобамі, якія кіруюць транспартнымі сродкамі Ўзброеных Сілаў, правілаў дарожнага руху; 5) службовымі асобымі мытных органаў - пры зьдзяйсьненьні адміністрацыйных мытных правапарушэньняў.

*Артыкул 242.* **Тэрміны адміністрацыйнага затрыманьня**

Адміністрацыйнае затрыманьне асобы, якая зьдзейсьніла адміністрацыйнае правапарушэньне, можа цягнуцца ня больш трох гадзінаў. У выключных выпадках, у сувязі з асаблівай неабходнасьцю заканадаўствам Рэспублікі Беларусь могуць быць устаноўленыя іншыя тэрміны адміністрацыйнага затрыманьня. Асобы, якія парушылі памежны рэжым ці рэжым у пунктах пропуску праз дзяржаўную мяжу РБ, могуць быць затрыманыя на тэрмін да трох гадзінаў для складаньня пратаколу, а ў неабходных выпадках для ўстанаўленьня асобы і высьвятленьня абставінаў правапарушэньня - да трох судняў з паведамленьне пра гэта пісьмова пракурору напрацягу дваццаці чатырох гадзінаў з моманту затрыманьня ці на тэрмін да дзесяці суднаў з санкцыі пракурора, калі правапарушальнікі ня маюць дакумэнтаў, якія пацьвярджаюць іхную асобу. Асоба, якая зьдзейсьніла дробнае хуліганства, парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня сходаў, мітынгаў, вулічных шэсьцяў і дэманстрацыяў, гандаль у неўстаноўленых месцах, незаконны продаж тавараў ці іншых прадметаў ці дробную спэкуляцыю, могжа быць затрыманая да разгляду справы народным судзьдзём ці начальнікам (намесьнікам начальніка) органа ўнутраных справаў. Тэрмін адміністрацыйнага затрыманьня адлічваецца з моманту дастаўленьня парушальніка для складаньня пратаколу, а асобы, якая знаходзіцца ў стане





ап'яненьня - з часу ейнага ацьверазеньня. За тры гадзіны павінен быць складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні. У выпадку, калі інкрымінаванае правапарушэньне можа разглядаць толькі суд, то пасьля складаньня пратаколу падазраваны ў правапарушэньні можа быць затрыманы на час да 72 гадзінаў да суду.

*Артыкул 247.* **Правы і абавязкі асобы, якая прыцягваецца да адміністрацыйнай адказнасьці**

Асоба, якая прыцягваецца да адміністрацыйнай адказнасьці, мае права знаёміцца з матэрыяламі справы, даваць тлумачэньні, прадстаўляць доказы, заяўляць хадайніцтвы; пры разглядзе справы карыстацца юрыдычнай дапамогай адваката, выступаць на роднай мове і карыстацца паслугамі перакладчыка, калі не валодае мовай, на якой вядзецца вытворчасьць; абскардзіць пастанову па справе. Справа аб адміністрацыйным правапарушэньні разглядаецца ў прысутнасьці асобы, якая прыцягваецца да адміністрацыйнай адказнасьці. У выпадку адсутнасьці гэтай асобы справа можа быць разгледжаная толькі тады, калі маюцца дадзеныя аб сваечасовым паведамленьні асобе аб месцы і часе разгляду справы і калі ад асобы не паступіла хадайніцтва аб адкладаньні разгляду справы. Пры разглядзе справаў аб адміністрацыйных правапарушэньнях прысутнасьць асобы, якая прыцягваецца да адміністрацыйнай адказнасьці, абавязковая. У выпадку ейнага ўхіленьня ад яўкі па выкліку органа ўнутраных справаў ці народнага судзьдзі гэтая асоба можа быць органам унутраных справаў (міліцыяй) паддадзеная прымусоваму прыводу.

*Артыкул 261.* **Пастанова па справе аб адміністрацыйным правапарушэньні**

Разгледзеўшы справу аб адміністрацыйным правапарушэньні, орган (службовая асоба) выносіць пастанову па справе. Пастанова выканаўчага камітэту пасялковай, сельскай Рады народных дэпутатаў па справе аб адміністрацыйным правапарушэньні прымаецца ў форме рашэньня. Пастанова павінна ўтрымліваць: назву органа (службовай асобы), які вынес пастанову, дату разгляду справы; зьвесткі аб асобе, у дачыненьні да якой разглядаецца справа; выклад абставінаў, устаноўленых пры разглядзе справы; указаньне на нарматыўны акт, які прадугледжвае адказнасьць за дадзенае адміністрацыйнае правапарушэньне; прынятае па



vytoki.net

справе рашэньне; тэрмін і парадак абскарджаньня пастановы, калі яна не зьяўляецца канчатковай, альбо ўказаньне, што пастанова зьяўляецца канчатковай і абскарджаньню ў парадку вытворчасьці па справах аб адміністрацыйных правапарушэньнях не падлягае. Рашэньне судзьдзі па адміністрацыйнай справе можа быць абскарджана толькі ў парадку нагляду. Для гэтага неабходна скласьці наглядную скаргу і адправіць яе службовым асобам, якія маюць права ўнесьці пратэст у парадку нагляду на пастанову судзьдзі па адміністрацыйнай справе. Пратэст могуць унесьці Старшыня абласнога (Менскага гарадзкога) суду і ягоныя намесьнікі, Старшыня і намесьнікі Старшыні Вярхоўнага суду, пракурор раёну (гораду), пракурор вобласьці (г. Менску) і ягоныя намесьнікі, Генэральны пракурор і ягоныя намесьнікі. Наглядныя скаргі можна накіроўваць як усім па чарзе, так і адначасова. Усе вышэйуказаныя службовыя асобы абавязаныя разгледзець наглядныя скаргі і даць пісьмовы адказ у месячны тэрмін.



# РАЗЬДЗЕЛ II ПЫТАНЬНІ ЮРЫДЫЧНАЙ ПСЫХАЛЁГІІ

Напэўна, няма неабходнасьці гаварыць аб тым, што любы кантакт з супрацоўнікамі сьледчых органаў носіць, перш за ўсё, псыхалягічны характар. Гэты кантакт можа быць з вашага боку дабраахвотным і дабразычлівым (калі вы хочаце дапамагчы ў раскрыцьці тыповага крымінальнага злачынства), але можа і ўяўляць сабой псыхалягічную барацьбу - калі перасьлед вас сьледзтвам носіць зусім іншы характар. У гэтую барацьбу вы вымушаныя ўступаць не на роўных умовах: сьледчы ўзброены спэцыяльнымі ведамі, вы - не. Задача дадзенага матэрыялу - данесьці да чытача некаторую частку інфармацыі па юрыдычнай псыхалёгіі. Калі веданьне свайго праціўніка, ягоных прыёмаў і мэтадаў хоць крыху дапаможа вам у гэтай няроўнай барацьбе - будзем лічыць, што праца зроблена недарма.

## ПСЫХАЛЁГІЯ ПАПЯРЭДНЯГА СЬЛЕДЗТВА

Уступ. Для рашэньня прафэсыйных задач у правапрымяняльнай дзейнасьці сучасны юрыст абавязаны валодаць комплексам ведаў і ўменьняў па псыхалёгіі, г.зн. быць псыхалягічна кампэтэнтным. Курс юрыдычнай псыхалёгіі выкладаецца на юрыдычных факультэтах унівэрсытэтаў, займае даволі вялікі аб'ём навучальнага часу і складаецца з розных па сваёй сутнасьці разьдзелаў: «Праўная псыхалёгія», «Крымінальная псыхалёгія», «Псыхалёгія папярэдняга сьледзтва», «Псыхалёгія адвакацкай дзейнасьці», «Псыхалёгія судовай дзейнасьці», «Папраўчая (пэнітэнцыйная) псыхалёгія». Тэматыка гэтага курсу даволі спэцыфічная, і людзі, ня маючыя юрыдычнай адукацыі, наўрад ці валодаюць ведамі ў гэтай галіне. Таму задача дадзенага матэрыялу данесьці, у нейкай ступені, некаторыя моманты з «Псыхалёгіі папярэдняга сьледзтва». У гэтую падборку ўключаныя ня толькі пытаньні псыхалёгіі допыту іператрусу, але і агульныя пытаньні псыхалягічнай характарыстыкі сьледчай дзейнасьці, а таксама пытаньні псыхалёгіі сьледчага і ягонай прафэсыйнай дэфармацыі асобы. Бяз гэтых дапаўненьняў веды аб псыхалёгіі папярэдняга сьледзтва былі б канчаткова няпоўнымі.





vytoki.net

# ПСЫХАЛЯГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА СЬЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЬЦІ. ПСЫХАЛЁГІЯ СЬЛЕДЧАГА

## § 1. Псыхалягічная характарыстыка сьледчай дзейнасьці

Для характарыстыкі дзейнасьці сьледчага з пункту гледжаньня псыхалёгіі неабходна падзяліць увесь комплекс такой дзейнасьці на асноўныя кампанэнты. У першую чаргу можна выдзеліць наступныя асноўныя складнікі прафэсыйнай дзейнасьці сьледчых і судзьдзяў: сацыяльна-палітычны, арганізатарскі, камунікатыўны, інфармацыйна-пошукавы (пазнавальны), рэканструктыўна-лягічны і афармляльны.

Сацыяльна-палітычная дзейнасьць заснаваная на тым, што сьледчы знаходзіцца на пярэднім краі барацьбы за выкараненьне злачыннасьці як зьявы. Яна ж павінна ўключаць праўную прапаганду, праўную асьвету, прафілактычныя мерапрыемствы і дзеяньні.

Арганізатарская дзейнасьць заключаецца ў дзеяньнях, накіраваных на рэалізацыю і праверку гіпотэзаў, адпрацоўку плянаў і вэрсіяў. Складаецца з двух кампанэнтаў: арганізацыя людзей, якія ўваходзяць у сьледчыя групы, для калектыўнага рашэньня прафэсыйных задач, і самаарганізацыя.

Камунікатыўная дзейнасьць - атрыманьне інфармацыі, зьвестак, паказаньняў мэтадам памаўленьня зь іншымі людзьмі. Найбольш праяўляецца пры допытах.

Інфармацыйна-пошукавая (пазнавальная) дзейнасьць - зьбіраньне сьледчым любой інфармацыі, якая б магла мець дачыненьне да справы, якая расьсьледуецца. Можа праводзіцца ня толькі ў кабінэце сьледчага, але і ў любым іншым месцы (напрыклад, у памяшканьнях, дзе працуе асоба, ад якой сьледчы разьлічвае атрымаць нейкую інфармацыю, альбо ў парку, сквэры). Рэканструктыўна-лягічная дзейнасьць - аналітычная праца над усёй сабранай інфармацыяй з выкарыстаньнем усяго комплексу прычынна-лягічных сувязяў і спэцыяльных ведаў; распрацоўка вэрсіяў, якія тлумачаць падзею, якая расьсьледуецца. Сканчэньне гэтай дзейнасьці - складаньне абвінаваўчага заключэньня (калі меўся склад злачынства) ці вынясеньне пастановы аб спыненьні справы (калі складу злачынства не было).

Афармляльная (пераконвальная) дзейнасьць - прывядзеньне ўсіх здабытых зьвестак у спэцыяльна





прадугледжаную законам форму: пратакол, пастанова, даручэньне і да т.п. Неабходна адразу адзначыць, што падзел сьледчай дзейнасьці на вышэйпрыведзеныя складнікі носіць у нейкай ступені ўмоўны характар. У практычнай дзейнасьці сьледчага яны часам настолькі пераплеценыя, узаемазьвязаныя, што ня мае ніякага сэнсу займацца іхным падзелам.

Складаючы для сябе разуменьне працы сьледчага, трэба заўсёды мець на ўвазе, што ў працэсе стасункаў сьледчага зь іншымі людзьмі (сьведкамі, падазраванымі, абвінавачванымі, экспэртамі і да т.п.) могуць узьнікаць як канфліктныя, так і бесканфліктныя сытуацыі.

Калі падыходзіць да панятку канфлікту, як да панятку суперніцтва, як да панятку тактычнага супрацьстаяньня з падазраванымі, то верагоднасьць канфліктнасьці сытуацыі не выклікае сумневаў. Разам з тым у панятках канфлікту неабходна рабіць іхны падзел на нутраны («закрыты») і вонкавы («адкрыты»). Нутраны канфлікт, як глыбока асабісты для сьледчага, які прыводзіць яго да разладу з самім сабой, застаецца па-за рамкамі нашага інтарэсу і ў дадзеным выпадку намі не разглядаецца. Вонкавыя («адкрытыя») канфлікты звычайна сустракаюцца пры ўзаемадачыненьнях сьледчага зь іншымі людзьмі - сьведкамі, падазраванымі, абвінавачванымі, супрацоўнікамі міліцыі і інш., безадносна да таго, ці ляжыць на іх нейкая віна, ці не. Пры вонкавым канфлікце сьледчы і супраціўны бок, аб'ектыўна імкнуцца да супрацьлеглых мэтаў. Больш за тое, ведаючы аб гэтым, яны пры складаньні асабістых плянаў улічваюць дзеяньні супраціўнага боку, узаемна ствараючы перашкоды, каб забясьпечыць сабе «перамогу». Пры гэтым трэба памятаць, што сьледчы абмежаваны рамкамі закону ў выбары мэтадаў і сродкаў пабудовы ўзаемадачыненьняў у дадзенай сытуацыі. (Часта да гэтых рамкаў дадаюць яшчэ нормы і абмежаваньні маральнага пляну).

Што тычыцца супрацьлеглага боку, то **a priori** лічыцца, што ён (калі гэта абвінавачваны) практычна нічым не абмежаваны. Пераходзячы да падставаў і ўмоваў вонкавых канфліктаў у сьледчай дзейнасьці, трэба адзначыць, што такія канфлікты трэба разглядаць як сыстэму бакоў, якія ўзаемадзейнічаюць. У гэтай сыстэме кожны з бакоў зьвязаны зь іншым пры дапамозе камунікацыі, суб'ектыўных ведаў і рэакцыяў паводзінаў. Адной з падставаў і ўмоваў вонкавага канфлікту можа выступаць адрозьненьне ва ўяўленьнях аб мэтах узаемадзеяньнямі між



vytoki.net

бакамі. Гэта можа выглядаць як неразуменьне некаторых агульных момантаў, якія зьяўляюцца падставай, якая аб'ядноўвае. Так, абвінавачваны (падазраваны, сьведка) бачыць у сьледчым толькі праціўніка, які імкнецца да дасягненьня ўласнай мэты. Часьцей за ўсё, ва ўмовах сучаснай палітычнай сытуацыі ў Беларусі, пры расьсьледаваньні справаў, ацэнка якім ужо была дадзеная «зьверху», такі пункт погляду ў значнай ступені абгрунтаваны. Відавочна, што абвінавачваны (падазраваны, сьведка) ня верыць, што сьледчы, побач са зборам доказаў, зьбірае таксама і апраўдальныя альбо памякчальныя віну доказы. У сваю чаргу, сьледчы, выконваючы атрыманае ад свайго кіраўніцтва заданьне, не жадае дапускаць думкі аб тым, што дадзенае заданьне, мякка кажучы, не зусім адпавядае Закону. З псыхалягічнага пункту гледжаньня такі канфлікт вырашыць даволі цяжка. У тэорыі канфлікту гэтая зьява называецца «адрозьненьнем у пазыцыях». Крыніцай вонкавага канфлікту можа быць ня толькі неразуменьне адзін аднаго, але і своеасаблівая немагчымасьць разуменьня. Па-першае, гэта выпадкі, калі адзін з удзельнікаў канфлікту тлумачыць штонебудзь у выразах, незразумелых для іншага, а па-другое, калі адзін з удзельнікаў спэцыяльна не разумее альбо ня хоча зразумець таго, хто гаворыць. У гэтых выпадках сэнс выказваньня аднаго ўдзельніка канфлікту не знаходзіць кропак судакрананьня з сэнсам выказваньня іншага. У тэорыі канфлікту гэта называецца «непадабенствам моваў», а ў псыхалёгіі — «сэнсавым бар'ерам».

У тэорыі канфлікту існуе зьява, якая называецца «ролевай супрацьлежнасьцю», якая можа таксама выступаць у якасьці падставы і ўмовы вонкавага канфлікту. У дадзеным выпадку канфлікт прадвызначаны самім фактам сустрэчы абодвух бакоў. Пры гэтым названыя бакі павінны загадзя выконваць супрацьлежныя сацыяльныя ролі. У дадзеным выпадку якаянебудзь сацыяльная роля выконваецца адным з бакоў з тыповым для гэтай ролі наборам прыкметаў, іншы ж бок заўсёды чакае рэалізацыі менавіта гэтых ролевых прыкметаў. Канфлікт тут разьвіваецца перш за ўсё ў сувязі з тым, што бакі ня бачаць агульнай плятформы для ўзаемадзеяньня, а ўяўленьне аб адсутнасьці магчымых «кропак су-дакрананьня» і ў той самы час адначасовая фіксацыя ўвагі на супярэчнасьцях ствараюць сытуацыю пастаяннага разьвіцьця гэтага канфлікту. Падобны вонкавы канфлікт узьнікае, напрыклад, пры адсутнасьці псыхалягічнага кантакту між абвінавачваным





і сьледчым, калі абвінавачваны, абапіраючыся на пачуцьцё ўласнай чалавечай годнасьці, адносіць сябе да катэгорыі незаконна, несправядліва перасьледаваных, а сьледчы выконвае ролю прыгнятальніка.

Як можна заўважыць з кароткага аналізу падставаў і ўмоваў вонкавых канфліктаў, узьнікаючых у ходзе папярэдняга сьледзтва, усе яны, як і, бессумнеўна, асабістыя, нутраныя канфлікты, павышаюць экстрэмальнасьць, «крытычнасьць» прафэсыйнай дзейнасьці сьледчага.

Такім чынам, разуменьне таго факту, што сьледчая дзейнасьць багатая на экстрэмальныя ўмовы, спрыяе, у нейкай ступені, прэвэнтыўнай псыхалягічнай падрыхтоўцы грамадзяніна.

### § 2. Псыхалёгія сьледчага. Прафэсыйныя якасьці сьледчага

Кожная прафэсія характарызуецца цэлым шэрагам прыкметаў, якія адрозьніваюць яе ад іншых. Сярод іх ёсьць галоўныя прыкметы, якія вызначаюць характар і спэцыфіку прафэсыйнай дзейнасьці. Да асноўных якасьцяў сьледчага, якія вызначаюць ягоную прафэсыйную дзейнасьць, часьцей за ўсё адносяць: - маральна-палітычныя; - інтэлектуальныя; - характаралягічныя; - псыхафізыялягічныя.

Дадзены матэрыял не прэтэндуе на паўнату псыхалягічных характарыстыкаў сьледчай дзейнасьці, таму пытаньне аб маральна-палітычных якасьцях сьледчага пакінем па-за рамкамі разгляду і пяройдзем адразу да інтэлектуальных (пазнавальных) якасьцяў.

ыНават пры самым павярхоўным азнаямленьні (хаця б па дэтэктыўнай літаратуры) з прафэсіяй сьледчага відавочны ейны пазнавальны, пошукавы характар. Лічыцца, што працэс расьсьледаваньня ня можа быць забясьпечаны адным дыскурсыўным (паняткава-лягічным) мысьленьнем. Такое мысьленьне эфэктыўна працуе ў строга абмежаванай сфэры, калі добра вядома, што трэба даказаць, а ўвесь неабходны для аналітыка-лягічнай апрацоўкі матэрыял сабраны. У гэтым выпадку думка рухаецца ад устаноўленых фактаў да пацьвярджэньня высунутай раней гіпотэзы (вэрсіі). Але само высоўваньне гіпотэзы (вэрсіі) адбываецца на падставе неабходных для ейнага ўзьнікненьня фактычных дадзеных. Пры гэтым і збор фактычных дадзеных і пабудова вэрсіі зьдзяйсьняецца пры пасярэдніцтве іншых псыхалягічных



vytoki.net

мэханізмаў інтэлектуальнай дзейнасьці. Сьледчы часта вымушаны працаваць, знаходзячыся ў праблемнай сытуацыі. У праблемнай сытуацыі заўсёды нечага нестае (іначай яна была б не праблемнай, а проста сытуацыяй), і гэтае вязьмо, якога нестае, павінна быць адшукана альбо сынтэзавана пры дапамозе мысьленчага працэсу. Па меншай меры, сьледчы павінен пры дапамозе гэтага мысьленчага працэсу вызначыць накірункі пошукаў недастаючай інфармацыі, яе меркаваных носьбітаў і здабыць у іх гэтую інфармацыю.

У ходзе расьсьледаваньня могуць узьнікаць розныя задачы. У залежнасьці ад іхнага характару і ад наяўнасьці пэўнага досьведу сьледчы мае справу з простымі і складанымі задачамі. У простых задачах сьледчы, абапіраючыся на розныя віды досьведу і маючы пэўныя формулы, схемы рашэньня, прымяняе ва ўзьніклай сытуацыі адну з наяўных у яго схемаў рашэньня. Творчыя задачы паўстаюць перад сьледчым пры рашэньні праблемнай сытуацыі. Рашэньне тут заключаецца ў тым, што на падставе аналізу ўмоваў задачы спэцыяльна для дадзенага выпадку ствараецца новая схема дзеяньняў. Але ў любым выпадку абсалютна відавочна, што перад сьледчым стаіць практычная задача - расьсьледаваньне канкрэтнай крымінальнай справы. Адсюль пераважальным відам сьледчага мысьленьня зьяўляецца практычнае мысьленьне. Акрамя таго, трэба таксама адзначыць, што мысьленьне сьледчага адрозьніваецца рэтраспэктыўнасьцю, бо расьсьледаваная падзея заўсёды знаходзіцца ў мінулым; рэфлексыўнасьцю, г.зн. ягоная інтэлектуальная дзейнасьць зьвязаная з аналізам уласных меркаваньняў, вывадаў і дзеяньняў і адначасовай імітацыяй думак і дзеяньняў іншых удзельнікаў канфліктнага ўзаемадзеяньня; пастаянным пераходам верагодных ведаў у праўдзівыя. Апэратыўнае мысьленьне сьледчага абумоўлена спэцыфікай ягонай прафэсіі і такімі ейнымі прыкметамі, як шматстайнасьць, складанасьць і нестабільнасьць абстаноўкі, дэфіцыт часу, неабходнасьць уліку процідзейных сілаў і г.д.

Нажаль, пры расьсьледаваньні справаў, маючых некаторую «палітычную» афарбоўку, дэфіцыт часу і адказнасьць за кожнае прынятае рашэньне ў сучасных умовах адыгрываюць усё меншую ролю. Тым ня менш, ня браць пад увагу фактар часу наўрад ці дамэтна. У ходзе расьсьледаваньня ў сьледчага час на абдумваньне і прыняцьце рашэньня максымальна скарочаны (пры ўмове, што сьледчы ня ўпэўнены ў працягу начальствам тэрмінаў расьсьледаваньня). На асобных этапах





ствараецца значная напружанасьць у працы. Асабліва часта яна ўзьнікае ў стадыі вытворчасьці першапачатковых сьледчых дзеяньняў, пры адкрыцьці новага эпізоду ці новых, раней не вядомых дзейных асобаў. Тут патрабуецца хуткасьць рэакцыі сьледчага на зноў атрыманыя дадзеныя, каб замацаваць доказы і забясьпечыць далейшую пасьпяховую працу. Але сьледчы - звычайны чалавек, і як доўга ён зможа працаваць з такой хуткасьцю? Пры тым, калі маецца дэфіцыт часу і адчуваецца пастаянны прэсінг начальства, патрабуючага запраграмаваных вынікаў? Гэтыя моманты надта важна ўлічваць пры канфліктных узаемадачыненьнях.

У псыхалёгіі побач з дыскурсыўным, ці паняткава-лягічным мысьленьнем, якое дапускае слоўнае фармуляваньне думкі хаця б у нутраной размове, выдзяляецца яшчэ і інтуітыўнае мысьленьне. Лічыцца, што гэтыя два віды мысьленьня адрозьніваюцца адзін ад аднаго па ролі слова ў іх, г.зн. першае мысьленьне слоўнае, а другое - нагляднае. Аднак гэта правільнае адрозьненьне ня трэба абсалютызаваць. Дыскурсыўнае і інтуітыўнае мысьленьне розьняцца па хуткасьці працяканьня і ўсьведамленьня ўсіх вязьмаў працэсу мысьленьня.

З кожным з нас напэўна бывалі выпадкі, калі пасьля больш ці менш доўгіх роздумаў быццам імгненна знаходзілася вырашэньне праблемнай сытуацыі. Рашэньне, як кажуць, дасягаецца інтуітыўна. Сьледчы таксама можа прыняць інтуітыўнае рашэньне. Часьцей за ўсё такое рашэньне не грунтуецца на праўдзівых доказах і фактах, хаця сьледчы пастараецца ўвесьці свайго візаві ў аблуду і не падаць выгляду, што яго «азарыла». Але вось інтуітыўнае рашэньне візаві сьледчага (сьведкі, падазраванага, абвінавачванага) можа прынесьці ў далейшым немалыя непрыемнасьці і да яго трэба ставіцца вельмі асьцярожна.

Мысьленчая дзейнасьць сьледчага перш за ўсё абумоўленая вонкавымі патрабаваньнямі ягонай прафэсіі, неабходнасьцю вырашаць задачы крымінальнай судавытворчасьці. Найбольш важнымі ўласьцівасьцямі дыскурсыўнага мысьленьня зьяўляецца ўменьне аналізаваць, абагульняць, сыстэматызаваць, пасьлядоўна, лягічна мысьліць. Зь якасьцяў інтуітыўнага мысьленьня важныя разьвітае творчае мысьленьне, вострая назіральнасьць, прадуктыўная мабільная памяць.

І, нарэшце, з агульных уласьцівасьцяў мысьленьня сьледчага неабходна адзначыць праніклівасьць, якая ўяўляецца асабліва важнай для сьледчага ў сувязі з тым, што папярэдняе сьледзтва ў пэўным аспэкце можна і трэба



vytoki.net

разглядаць як спэцыфічны псыхалягічны досьлед, маючы практычны характар і зьдзяйсьняны ў рамках крымінальна-працэсуальнага дзеяньня.

Сапраўды, сьледчы абавязаны ведаць суб'ектыўны бок расьсьледаванай справы, псыхалягічныя асаблівасьці асобаў, якія праходзяць у якой-небудзь якасьці па справе, іхны псыхічны стан. Праніклівасьць неабходная ня толькі для пазнавальнай, але і камунікатыўнай дзейнасьці сьледчага, бо без разуменьня іншых людзей эфэктыўнае памаўленьне немагчымае. У гэтым пляне праніклівасьць блізкая да эмпатыі як здольнасьці адрозьніваць думкі і пачуцьці іншага, ведаючы ягоныя ацэнкі і самаацэнкі.

Псыхолягі сьцьвярджаюць, што часьцей за ўсё ім дастаткова паназіраць, як чалавек адчыняе дзьверы ў іхныя кабінэты, уваходзіць і ідзе да стала ўрача-псыхоляга, каб скласьці для сябе амаль беспамылковы псыхалягічны партрэт пацыента.

Цалкам верагодна, што і многія сьледчыя здольныя зрабіць такую ацэнку за вельмі кароткі прамежак часу.

**Характаралягічныя якасьці сьледчага**

Характар - складанае псыхалягічнае ўтварэньне асобы, ён найбольш поўна адлюстроўвае яе цэльнасьць і індывідуальнасьць. Характар ня толькі выражае цэльнасьць асобы, але і зьяўляецца абавязковай умовай гэтай цэльнасьці. Будучы вынікам разьвіцьця асобы, характар становіцца адной з умоваў яе разьвіцьця.

З агульных характаралягічных якасьцяў сьледчага найбольшы інтарэс уяўляюць прынцыповасьць, пасьлядоўнасьць і мэтанакіраванасьць. *Прынцыповасьць* - наяўнасьць уласных перакананьняў і актыўнае імкненьне да іхнай рэалізацыі, увасабленьнеяў жыцьцё, нягледзячы на перашкоды. *Пасьлядоўнасьць* - здольнасьць рэалізаваць намечаны плян дзеяньняў, даводзіць пачатую справу да канца. *Мэтанакіраванасьць* выражаецца ў падпарадкаваньні дзейнасьці сьледчага асноўнай мэце.

Посьпех у зьдзяйсьненьні сьледчым камунікатыўнай дзейнасьці, у прыватнасьці ва ўстанаўленьні псыхалягічнага кантакту з дапытванымі асобамі, у значнай меры залежыць ад таго, ці валодае ён такой рысай характару, як таварыскасьць. Валявая сфэра характару ўключае ў сябе цэлы шэраг уласьцівасьцяў. Найбольш яскравымі валявымі рысамі зьяўляюцца рашучасьць, апэратыўнасьць, ініцыятыўнасьць.

**Псыхафізыялягічныя якасьці сьледчага**



Псыхафізіялягічныя якасьці ў сваіх праявах у дзейнасьці, паводзінах чалавека знаходзяцца ў шчыльнай сувязі зь ягонымі нэйрафізыялягічнымі асаблівасьцямі.

Да іх можна аднесьці эмацыйную ўраўнаважанасьць, здольнасьць да засяроджаньня, псыхічную выносьлівасьць, аб'ём і разьмеркаваньне ўвагі і г.д. Спэцыфічна псыхалягічнай праявай уласьцівасьцяў нэрвовай сыстэмы зьяўляецца тэмпэрамэнт чалавека. Іншымі словамі, псыхафізыялягічныя ўласьцівасьці - гэта ўласьцівасьці тэмпэрамэнту. Асноўнымі сярод іх могуць быць працаздольнасьць, псыхічная выносьлівасьць, здольнасьць да засяроджаньня, хуткая арыентыроўка ў новых умовах, «перашкодаўстойлівасьць».

Пералічаныя вышэй прафэсыйныя якасьці сьледчага зьяўляюцца важнейшымі, хаця і не вычарпальнымі. Разам з тым, як бы ні адрозьніваліся адна ад адной названыя групы якасьцяў, яны арганічна зьвязаныя міжсобку і ўяўляюць у дзейнасьці сьледчага цэльнае адзінства.

## § 3. Прафэсыйная дэфармацыя асобы сьледчага

Любы род дзейнасьці спрыяе разьвіцьцю і замацаваньню ыпэўных прафэсыйна важных якасьцяў спэцыяліста. Разам з тым сьледчая дзейнасьць мае такія псыхалягічныя асаблівасьці, якія могуць прывесьці да непажаданых зьменаў у асобе, якія адмоўна ўплываюць на працу. У гэтых выпадках кажуць аб прафэсыйнай дэфармацыі.

Зьяўленьню дэфармацыі спрыяюць розныя перадумовы: аб'ектыўныя (пэўныя асаблівасьці той ці іншай прафэсіі) і суб'ектыўныя (асабістая псыхалягічная схільнасьць работніка да зьяўленьня і разьвіцьця ў яго адмоўных прафэсыйных якасьцяў). Такія асаблівасьці сьледчай дзейнасьці, як ненармаваны працоўны дзень, наяўнасьць стрэс-фактараў (дэфіцыт часу, фізычныя і інфармацыйныя перагрузкі і інш., адсутнасьць рытмічнасьці ў працы) могуць прывесьці да зьяўленьня пасьпешнасьці, неахайнасьці і разбадзянасьці, недысцыплінаванасьці, маруднасьці ў расьсьледаваньні крымінальных справаў.

Адзначаныя вышэй асаблівасьці (стрэс-фактары і інш.) могуць прывесьці і да так званаму «праўнаму нігілізму», які мае месца тады, калі некаторыя работнікі пачынаюць ігнараваць крымінальна-працэсуальныя нормы і закон. Пастаяннае памаўленьне з правапарушальнікамі можа прывесьці да





vytoki.net

зьяўленьня і разьвіцьця ў сьледчага падазронасьці, агульнага недаверу да людзей. Будучы антыподам такой важнай прафэсыйнай рысы, як пільнасьць, падазронасьць (роўна як і недавер) зьяўляецца вельмі небясьпечным відам прафэсыйнай дэфармацыі, паколькі непазьбежна вядзе да прадузятасьці, тэндэнцыйнасьці, неаб'ектыўнасьці і, у канцавым выніку, да абвінавачвальнага ўхілу працэсу расьсьледаваньня, што ў сваю чаргу можа прывесьці да грубых памылак, такіх, як прыцягненьне да адказнасьці невінаватых.

Сьледчы надзелены ўладнымі паўнамоцтвамі, неабходнымі яму для хуткага спыненьня злачыннай дзейнасьці, для пераадоленьня няпраўных узьдзеяньняў, для адшуканьня і канфіскацыі рэчавых доказаў і г.д. Аднак няправільнае разуменьне сваіх паўнамоцтваў і няўменьне карыстацца імі ў выпадку бескантрольнасьці і безадказнасьці нараджае злоўжываньне ўладай.

Праўная рэглямэнтацыя сьледчай дзейнасьці можа прывесьці і да звычкі меркаваць і дзейнічаць па шаблёне, спасылаючыся пры гэтым на артыкул КПК, інструкцыю, распараджэньне начальства. Прытрымліваньне закону можа спрыяць зьяўленьню такой небясьпечнай рысы, як фармалізм, у выніку чаго сьледчы становіцца абыякавым да людзей, іхных лёсаў.

Сярод суб'ектыўных перадумоваў, нараджаючых прафэсыйную дэфармацыю асобы сьледчага, важнае месца займае нізкі ўзровень ягонага маральнага разьвіцьця.

Ужо адзначалася, што камунікатыўная дзейнасьць сьледчага працякае ў канфліктных сытуацыях, яму даводзіцца памаўляцца з выключна цяжкімі «суразмоўцамі» - падазраваным, абвінавачваным, несумленнымі сьведкамі. Ясна, што памаўленьне з такімі асобамі само па сабе можа прыводзіць да зьяўленьня грубасьці, раздражняльнасьці, эмацыйных зрываў і г.д. Наяўнасьць жа нізкага маральнага і культурнага ўзроўню стварае псыхалягічную схільнасьць да ўзьнікненьня і замацаваньня названых дэфармацыйных якасьцяў. Агромністую шкоду раскрыцьцю злачынстваў прыносіць такая рыса, як кар'ерызм. Жадаючы выслужыцца любой цаной, такі работнік можа без дастатковых падставаў затрымаць каго-небудзь па мінімальным падазрэньні, любымі сродкамі дабіцца ў затрыманага прызнаньня, праводзіць пасьпешна апэратыўна-сьледчыя дзеяньня і г.д. Усё гэта можа прывесьці да грубых парушэньняў законнасьці. Кар'ерызм схіляе да зьяўленьня і разьвіцьця фармалізму, чэрствасьці і абыякавасьці да людзей, суб'ектывізму, падхалімства і іншых дэфармацыйных якасьцяў.





# ПСЫХАЛЁГІЯ ДОПЫТУ

Допыт - самы распаўсюджаны спосаб атрыманьня доказаў па справе і ў той самы час адно з самых складаных сьледчых дзеяньняў. Асноўнымі псыхалягічнымі задачамі допыту зьяўляюцца дыягностыка праўдзівасьці паказаньняў, аказаньне псыхалягічнага ўзьдзеяньня з мэтай атрыманьня неабходных і выяўленьня ілжывых паказаньняў.

## § 1. Псыхалягічныя аспэкты падрыхтоўкі сьледчага да допыту

Адна з асноўных задачаў сьледчага пры падрыхтоўцы да допыту - стварэньне ягонай інфармацыйнай базы, што дасягаецца зьбіраньнем выходных дадзеных.

Выходныя дадзеныя для допыту па сваіх крыніцах і зьмесьце неаднародныя і могуць быць атрыманыя рознымі спосабамі, у тым ліку і з апэратыўных крыніцаў. Вывучэньне асобы дапытванага неабходнае для вызначэньня найбольш эфэктыўных прыёмаў псыхалягічнага ўзьдзеяньня на дадзеную асобу, а таксама для пабудовы верагодных мадэляў яе паводзінаў на допыце. «Плянуючы пераадоленьне магчымага процідзеяньня, — адзначае М. І. Енікееў, — неабходна ўлічваць такія асаблівасьці дапытванага, як рэфлексыўнасьць, гнуткасьць альбо рыгіднасьць (застойнасьць) ягонага мысьленьня, а таксама характаралягічныя якасьці: агрэсыўнасьць, канфліктнасьць паводзінаў, устойлівасьць альбо няўстойлівасьць да стрэсаў, да нечакана ўзьніклых абставінаў.

Паколькі выходныя дадзеныя аб асобе дапытванага часта бываюць недастатковымі, магчымая пабудова некалькі найбольш верагодных мадэляў паводзінаў асобы, якую дапытваюць, і варыянтаў тактыкі гэтага допыту». Важным элемэнтам падрыхтоўкі да допыту зьяўляецца складаньне ягонага пляну. Плян можа быць разгорнутым ці кароткім, пісьмовым альбо мысьленным. Ён павінен утрымліваць пералік пытаньняў, якія ў сьледчай тактыцы дзеляцца на дадатковыя, удакладняльныя, нагадвальныя, кантрольныя, выкрывальныя. Дадатковыя пытаньні задаюць з мэтай дадаць атрыманыя паказаньні, вырашыць прабелы, якія ў іх былі. Яны могуць быць накіраваныя на дэталізацыю паказаньняў. Удакладняльныя пытаньні таксама могуць задавацца з мэтай дэталізацыі паказаньняў, але часьцей — для ўдакладненьня, канкрэтызацыі атрыманых зьвестак. Нагадвальныя пытаньні



vytoki.net

накіраваныя на ажыўленьне памяці дапытванага, на ўзьнікненьне тых альбо іншых асацыяцыяў, пры дапамозе якіх ён прыгадае факты, якія цікавяць сьледчага. Нагадвальных пытаньняў звычайна задаецца некалькі, каб дапамагчы дапытванаму прыгадаць абставіны забытай падзеі. Пры гэтым нагадвальныя пытаньні ня трэба зьмешваць з навадным пытаньнямі, якія забароненыя законам. Кантрольныя пытаньні задаюцца з мэтай праверкі атрыманых зьвестак. Выкрывальныя пытаньні накіраваныя на выкрываньне дапытванага ў ілжы, відавочнай для сьледчага. Звычайна яны суправаджаюцца прад'яўленьнем дапытванаму праўдзівых доказаў, якія абвяргаюць ягоныя паказаньні. Да суб'ектыўных фактараў, вызначаючых пасьпяховасьць допыту, адносіцца стан гатовасьці да допыту сьледчага і дапытванага. Перад складаным допытам сьледчы павінен быць у добрай «форме», г.зн. у такім эмацыйна-валявым стане, які б забясьпечваў яму свабоднае апэраваньне наяўнымі матэрыяламі справы, пасьпяховы кантроль за псыхікай дапытванага і кіраваньне гэтай псыхікай з мэтай атрыманьня ад дадзенай асобы найбольш поўных паказаньняў. Сьледчы павінен таксама ўмець кантраляваць уласны псыхічны стан падчас допыту.

## § 2 Псыхалёгія допыту сьведкі

Сьведкам можа быць прызнана любая асоба, якая здольная ўспрымаць абставіны, маючыя значэньне для справы, і даваць аб іх паказаньні, за выключэньнем абаронцы абвінавачванага. Сьведкам можа быць як чалавек, беспасярэдне ўспрымаючы падзею злачынства, так і той, каму стала вядома аб гэтым са словаў іншых асобаў альбо дакумэнтаў, а таксама зь іншых крыніцаў.

Допыт сьведкаў і пацярпелага падзяляецца на чатыры стадыі: устанаўленьне псыхалягічнага кантакту з дапытваным; свабодны аповед дапытванага; пастаноўка ўдакладняльных пытаньняў; азнаямленьне з пратаколам і магнітным запісам паказаньняў. На ўстанаўленьне кантакту ўплываюць абстаноўка допыту, манера паводзінаў сьледчага, уменьне валодаць сабой, ягоны тон, вонкавы выгляд. Пасьля ўстанаўленьня кантакту з дапытваным сьледчы прапаноўвае яму расказаць усё, што вядома па справе. Дадзены этап допыту называецца свабодным аповедам дапытванага, у працэсе якога ён выкладае вядомыя яму факты ў той пасьлядоўнасьці, якую ён выбірае сам альбо якую яму рэкамэндуе сьледчы. Часьцей за ўсё сьледчы ня стане





перапыняць пытаньнямі альбо рэплікамі свабодны аповед дапытванага. Пасьля выкладу паказаньняў сьледчы пры дапамозе розных пытаньняў удакладняе, запаўняе прабелы, выяўляе новыя факты, не ўзгаданыя ў свабодным аповедзе. Калі атрыманыя паказаньні, на думку сьледчага, зьяўляюцца ілжывымі, то ён павінен: - пры дабрасумленнай аблудзе дапытванага дапамагчы яму выправіць памылкі; - пры наўмыснай дачы ілжывых паказаньняў — выкрыць яго ў ілжы і прымусіць даць праўдзівыя паказаньні. Як паказвае сьледчая практыка, у шмат якіх выпадках дапытваныя забываюць нейкія асобныя дэталі падзеі, якая цікавіць сьледзтва. Забываньне — натуральны працэс, таму сьледчага павінна насьцярожваць ня столькі тое, што дапытваны забыўся на нейкія факты, колькі тое, што ён надта лёгка прыводзіць падрабязнасьці даўняй падзеі: гэта можа сьведчыць аб завучаных паказаньнях.

У мэтах «ажыўленьня» памяці сьведкі (гэтыя прыёмы можна выкарыстоўваць таксама і пры допыце падазраванага і абвінавачванага) і прыцягненьня яго да гаварлівасьці прымяняюцца наступныя тактычныя прыёмы:

1. Допыт з выкарыстаньнем асацыятыўных сувязяў а) Па сумежнасьці. Каб «дапамагчы» дапытванаму прыгадаць той факт, які цікавіць сьледчага, яму нагадваецца аб прадмеце ці зьяве, якія знаходзіліся з прадметамі допыту ў прасторавай альбо часавай сувязі. б) Па падабенстве. Аналягічную функцыю, што і ў папярэднім прыёме, выконвае прад'яўленьне дапытванаму прадметаў, словаў, выразаў, якія ня тычацца беспасярэдне справы. Прапанаваны сьледчым раздражняльнік (напрыклад, фатаздымак чалавека) можа выклікаць у памяці дапытванага вобраз нейкага чалавека, падобнага да таго, што на фатаздымку. в) Па кантрасьце. Напрыклад, падзея, якая цікавіць сьледзтва, адбылася летам. Калі дапытванаму цяжка сказаць, калі адбылася гэтая падзея, то, нагадаўшы яму аб зіме, можна атрымаць адмоўны адказ. Наступныя адмоўныя адказы - вясны і восені - прывядуць да патрэбнага выніку. г) Пры дапамозе нагляднасьці. Гэты прыём прымяняецца ў тым выпадку, калі дапытванаму цяжка сфармуляваць словамі тыя альбо іншыя прыкметы прадмета, зьявы. Тады яму прад'яўляюць тыя ці іншыя прадметы, зьвязаныя з абставінамі, якія цікавяць сьледзтва.

2. Паўторны допыт па абмежаваным коле абставінаў Пры паўторнай дачы паказаньняў дапытваны можа ўзгадаць прапушчаныя ім пры першым допыце факты, абставіны. Тлумачыцца гэта псыхалягічным мэханізмам рэмінісцэнцыі,



vytoki.net

пад якім разумеецца зьява ўзмацненьня ў памяці новых сэнсавых сувязяў пры адтэрмінаваным узнаўленьні.

### § 3. Псыхалёгія допыту падазраванага і абвінавачванага

Допыт падазраванага і абвінавачванага ў параўнаньні з допытам сьведкі і пацярпелага мае свае асаблівасьці. Гэтыя асаблівасьці праяўляюцца ўжо ў спэцыфіцы ўстанаўленьня псыхалягічнага кантакту.

Адна з задачаў сьледчага заключаецца ў тым, каб дапытваны даверыўся сьледчаму і ягоным тлумачэньням, што сумленнае прызнаньне сваёй віны і дача праўдзівых паказаньняў памякчыць ягоную віну. Такая пазыцыя абвінавачванага, безумоўна, зьяўляецца падставай для ўстанаўленьня кантакту між сьледчым і дапытваным. Больш складаным можа аказацца ўстанаўленьне кантакту з абвінавачваным, які настроіўся на дачу ілжывых паказаньняў. Допыт у гэтым выпадку набывае характар процістаяньня, і ў такіх умовах псыхалягічнай задачай сьледчага зьяўляецца пасяленьне ў абвінавачванага павагі да свайго праціўніка, пачуцьця безнадзейнасьці падмануць сьледчага.

Аднак у большасьці выпадкаў сьледчаму прыходзіцца сутыкацца з такой сытуацыяй, калі абвінавачваны ў пачатковай стадыі расьсьледаваньня адмаўляецца ад дачы паказаньняў. Тады сьледчаму прыходзіцца аказваць на такога абвінавачванага тактычнае ўзьдзеяньне, якое зьдзяйсьняецца шляхам:

1) перакананьня абвінавачванага ў няправільнасьці занятай ім пазыцыі;
2) выкарыстаньня факту дачы паказаньняў саўдзельнікамі абвінавачванага;
3) выкарыстаньня супрацьлежнасьцяў між інтарэсамі саўдзельнікаў.

Тактыка допыту падазраванага падобная да тактыкі допыту абвінавачванага, хаця і мае некаторыя асаблівасьці. Яны заключаюцца ў тым, што дадзеныя аб асобе падазраванага, якімі валодае сьледчы, звычайна абмежаваныя. Апрача таго, у сьледчага пры допыце падазраванага яшчэ няма пераканаўчых доказаў, як пры допыце абвінавачванага. Разам з тым ёсьць і перавага - фактар нечаканасьці, што не дазваляе дапытванаму прадумаць лінію абароны, падумаць, якімі доказамі ягонай віны валодае сьледзтва.





### § 4. Псыхалягічныя асаблівасьці допыту пры выкрываньні дапытванага ў ілжы

Ілжывыя паказаньні даюць ня толькі падазраваныя, але і сьведкі. Дапытваны можа даваць ілжывыя паказаньні як у сваіх інтарэсах, так і на шкоду ім (напрыклад пры самаабгаворваньні).

Матывамі дачы ілжывых паказаньняў сьведкам могуць быць наступныя: - боязь помсты з боку падазраванага, абвінавачванага, іхных сваякоў і знаёмых; - боязь сапсаваць адносіны зь іншымі асобамі, якія праходзяць па справе; - жаданьне выгарадзіць альбо памякчыць віну падазраванага (абвінавачванага) у сілу сваяцкіх, сямейных, сяброўскіх сувязяў альбо з-за карысьлівых перакананьняў, а таксама супрацьлежны намер паглыбіць віну ўказаных асобаў — з помсты, рэўнасьці і г. д.; - нежаданьне ў далейшым выступаць у якасьці сьведкі альбо ўдзельніка іншага сьледчага дзеяньня, быць выкліканым у суд і г.д.; - імкненьне схаваць свае ўласныя непрыстойныя ўчынкі і г.д.

Што тычыцца матываў дачы ілжывых паказаньняў падазраваным і абвінавачваным, то яны вельмі разнастайныя.

У сьледчай практыцы найбольш часта сустракаюцца наступныя: - жаданьне пазьбегнуць адказнасьці за створанае альбо паменшыць сваю віну, альбо панесьці пакараньне не за зьдзейсьненае, а за менш цяжкае злачынства - сапраўднае альбо ўяўнае; - імкненьне выгарадзіць альбо памякчыць віну іншых асобаў, якія праходзяць па справе, у сілу сяброўскіх, сямейных альбо сваяцкіх сувязяў, з карысьлівых перакананьняў; - імкненьне абгаварыць саўдзельнікаў з помсты альбо ў мэтах забесьпячэньня ўласнай бясьпекі ў будучым, а таксама агаварыць сябе ў сілу хваравітага стану псыхікі альбо з «геройства» і г.д.; - імкненьне абгаварыць сябе, каб схаваць несамавітыя, у тым ліку і злачынныя, паводзіны блізкага чалавека. Асоба, якая дае загадзя ілжывыя паказаньні, аказвае процідзеяньне сьледзтву, уступае са сьледчым у барацьбу, у выніку чаго ствараецца канфліктная сытуацыя. Каб выкрыць дапытванага ў дачы ілжывых паказаньняў сьледчаму неабходна выкарыстаць тактычныя прыёмы.

Пры выкрываньні ў ілжы сьведкі прыбегнуць да такіх прыёмаў: - перакананьне ў няправільнасьці занятай пазыцыі, яе антыграмадзянскім характары; - тлумачэньне праўных наступстваў дачы ілжывых паказаньняў; - тлумачэньне шкодных наступстваў дачы ілжывых паказаньняў для блізкіх



vytoki.net

дапытванай асобы зь ліку падазраваных, абвінавачваных; - узьдзеяньне на станоўчыя бакі асобы дапытванага (пачуцьцё ўласнай годнасьці, сьмеласьць, дабрапрыстойнасьць, прынцыповасьць і г.д.). Сьледчая тактыка валодае цэлым арсэналам прыёмаў выкрываньня падазраванага і абвінавачванага ў дачы імі ілжывых паказаньняў, а таксама аказаньня на іх псыхалягічнага ўзьдзеяньня з мэтай атрымаць неабходныя паказаньні. Разгледзім асноўныя.

1. Перакананьне. Гэты прыём заключаецца ў звароце сьледчага да здаровага розуму дапытванага, заахвочваньні яго да раскаяньня і сумленнага прызнаньня.

2. Выкарыстаньне станоўчых уласьцівасьцяў асобы дапытванага. Кожнаму чалавеку ўласьцівае імкненьне да самапавагі і таму, апэлюючы да сумленнасьці, дабрапрыстойнасьці дапытванага, да ягоных заслугаў у мінулым, аўтарытэту ў асяродзьдзі адзінадумцаў, асабістаму сацыяльнаму статусу, можна дасягчы шчырасьці.

3. Спыненьне ілжы. Дадзены прыём прымяняецца тады, калі няма неабходнасьці даваць магчымасьць сьведку, падазраванаму альбо абвінавачванаму «разгортваць» ману, калі ў сьледчага маецца праўдзівая інфармацыя што да абставінаў, якія высьвятляюцца падчас допыту. Страціўшы надзею на магчымасьць дэзынфармаваць сьледчага, выкрыты фактамі, дапытваны часта губляецца.

4. Вычэкваньне. Гэты прыём прымяняецца да асобаў, у якіх адбываецца барацьба матываў, адзін зь якіх падахвочвае да дачы ілжывых паказаньняў альбо адмовы ад дачы паказаньняў, а другі - да прызнаньня сваёй віны, раскаяньня. Такая барацьба згасае і можа праявіцца дастаткова моцна пры ўмелым тактычным узьдзеяньні сьледчага і ў працэсе допыту. Улічваючы хістаньні дапытванага, сьледчы, паведамляючы пэўныя зьвесткі, наўмысна «закладае» ў ягоную сьвядомасьць такую інфармацыю, якая павінна забясьпечыць перамогу неабходных матываў, і затым робіць перапынак у допыце, вычэкваючы, калі дапытваны сам адмовіцца ад матываў, якія падахвоцілі яго да дачы ілжывых паказаньняў.

5. Дапушчэньне легенды. Нярэдка сьледчы, ведаючы альбо здагадваючыся аб тым, што падазраваны альбо абвінавачваны дае ілжывыя паказаньні — легенду, дае яму магчымасьць выкласьці яе. Уступіўшы ў сваго роду гульню з дапытваным, ён сыходзіць з намеру выцягнуць у таго як мага больш дэталяў, канкрэтыкі, падрабязнасьцяў і як мага больш





дакладна зафіксаваць аповед у пратаколе допытаў. Даўшы магчымасьць дапытванаму выказаць усё, што яму захочацца, сьледчы прад'яўляе важкія доказы, якія абвяргаюць і выкрываюць легенду. Засьпеты неспадзеўкі і не падрыхтаваны да стварэньня новай легенды, дапытваны зноў губляецца.

6. Неспадзяванасьць. Дадзены прыём, заключаецца ў нечаканым для дапытванага рашэньні сьледчага правесьці пасьля допыту тое альбо іншае сьледчае дзеяньне, у той час як дапытваны, перакананы ў неінфармаванасьці сьледчага пра тыя ці іншыя абставіны справы, лічыць гэта немагчымым. Разнавіднасьцю выкарыстаньня фактару неспадзяванасьці на допыце зьяўляецца такі распаўсюджаны прыём выкрываньня, як нечаканае прад'яўленьне доказаў. Эфэктыўнасьць гэтага прыёму залежыць таксама ад таго, ці дапускае падазраваны альбо абвінавачваны, што дадзеныя доказы могуць аказацца ў сьледчага.

7. Пасьлядоўнасьць. Гэты прыём па сваім характары супрацьлежны папярэдняму. Лічыцца, што іншы раз трэба прад'яўляць доказы пасьлядоўна (па прыкладзе ўзрастаньня паказальнай сілы) і сыстэматычна, падрабязна спыняючыся на кожным зь іх, каб даць абвінавачванаму «адчуць» усю сілу асобнага доказу і ўсяго іхнага комплексу. Увогуле ў сьледчай тактыцы існуе цэлы арсэнал прыёмаў прад'яўленьня доказаў:

1) асобнае прад'яўленьне розных доказаў у той ці іншай пасьлядоўнасьці;
2) аднačасовае прад'яўленьне ўсіх наяўных доказаў;
3) прад'яўленьне спачатку ўскосных, а затым прамых доказаў;
4) неспадзяванае прад'яўленьне доказу (аб чым размова ішла вышэй);
5) прад'яўленьне доказаў па нарастаючай іхнай важкасьці;
6) прад'яўленьне комплексу доказаў пасьля папярэдняга паведамленьня абвінавачванаму аб наяўнасьці доказаў, іхнага пералічэньня з указаньнем крыніцаў іхнага паходжаньня (альбо без указаньня);
7) прад'яўленьне доказаў быццам незнарок, ненаўмысна;
8) прадстаўленьне абвінавачванаму магчымасьці самому вывучыць доказ і ацаніць ступень ягонай пераканальнасьці;
9) фіксацыя ўвагі на асобных прыкметах доказаў;
10) суправаджэньне працэсу прад'яўленьня доказу тлумачэньнем мэханізму ягонага ўтварэньня, абставінаў ягонага адшуканьня;
11) прад'яўленьне доказаў з дэманстрацыяй магчымасьці тэхніка-крыміналістычных сродкаў па выяўленьні і



vytoki.net

расшыфроўцы схаванай інфармацыі, якая ўтрымліваецца ў гэтай крыніцы.

8. Зьняцьцё напружаньня. Нярэдка падчас допыту абвінавачваны не адмаўляецца ад размовы, але і ня можа яе весьці, бо адчувае сябе скаваным, вельмі напружаным. У гэтым выпадку сьледчы, узьдзейнічаючы на дапытванага пэўным чынам, іншы раз толькі інтанацыямі голасу, асобнымі фразамі стараецца зьняць гэтую напружанасьць. Пасьпяховае зьняцьцё напружаньня даволі часта цягне за сабой шчырае прызнаньне. Палёгка, якая наступіла пасьля зьняцьця напружаньня, выклікае ў дапытванага імкненьне «выказацца ў размове», «пагутарыць па душах».

9. Выкарыстаньне «слабых месцаў» асобы абвінавачванага. Пад «слабым месцам» асобы трэба разумець такія ейныя асаблівасьці, выкарыстоўваючы якія можна дасягчы неабходных паказаньняў на допыце. «Слабым месцам» дапытванага можа быць схільнасьць да мэлянхалічных перажываньняў, запальчывасьць, славалюбства і г.д. Так, у запальчывасьці і гневе абвінавачваны распавядзе тое, чаго ня выказаў бы ў звычайным стане (напрыклад, назаве нейкія прозьвішчы, імёны).

10. Інэрцыя. Гэта своеасаблівы прыём, сутнасьць якога зводзіцца да таго, што сьледчы, гаворачы з абвінавачваным, незаўважна пераводзіць размову са сфэры адцягненай, пабочнай размовы ў сфэру размовы па сутнасьці. Пры гэтым абвінавачваны, кажучы аб «пабочным», «па інэрцыі» прагаворваецца аб тым, аб чым не хацеў бы гаварыць. Для атрыманьня большага эфэкту неабходна часьцей зьдзяйсьняць такія пераходы ад аднаго прадмета гутаркі да іншага.

11. Адцягненьне ўвагі. Абвінавачваны заўсёды чуйна і пільна сочыць за ходам допыту з мэтай зразумець, што для сьледчага важна і што ўяўляецца яму другасным. У сувязі з гэтым дапытваны імкнецца засяродзіцца на нечым адным, на ягоную думку, галоўным. «Улічваючы гэтыя абставіны, — адзначаюць Л. Б. Філонаў і В. І. Давыдаў, — сьледчыя штучна пераводзяць увагу дапытванага на ўчасткі, ня маючыя першаснага значэньня, і тым самым адцягваюць ягоную ўвагу ад найбольш важных участкаў. Усё гэта робіцца ў разьліку на тое, што дапытваны будзе ставіцца зь меншай асьцярожнасьцю, больш неахайна да тых абставінаў, аб якіх сьледчы хацеў бы атрымаць больш дэтальную інфармацыю».

12. Стварэньне ўражаньня добрай інфармаванасьці





сьледчага. Сутнасьць гэтага прыёму заключаецца ў тым, што сьледчы пераконвае дапытванага ў сваёй інфармаванасьці. Гэта можа дасягацца, па-першае, уменьнем паводзіць сябе пэўным чынам, па-другое, пры дапамозе праўдзівай інфармацыі, у той час як абвінавачваны не падазрае, што гэта за зьвесткі (асобныя дэталі біяграфіі, факты са справы і г.д.). У выніку ў дапытванага ствараецца ўражаньне, што сьледчы ведае ня толькі асобныя падрабязнасьці справы, але і ўсё астатняе. Гэта ў выніку можа прымусіць абвінавачванага супыніць запіраньне.

13. Стварэньне «незапоўненасьці». Гэты прыём прымяняецца ў тых выпадках, калі пры адсутнасьці дастатковай колькасьці доказаў сьледчы вядзе свой аповед, абапіраючыся на шэраг праўдзівых фактаў. Ён толькі паказвае абвінавачванаму «незапоўненыя» месцы ў справе. У той самы час, вымалёўваючы ў асноўным дастаткова ясную і поўную карціну падзеі, ён разам з дапытваным прасочвае лёгіку асобных фактаў і прапаноўвае яму запоўніць няясныя месцы. Гэтыя незапоўненыя месцы і няяснасьці, адзначаныя сьледчым, выклікаюць у дапытванага неспакой і натуральную патрэбу вызваліцца ад нелягічнасьці, прывесьці ўсё сказанае ў адпаведнасьці зь лёгікай.

14. Фарсіраваны тэмп допыту. Гэты прыём заключаецца ў тым, што сьледчы, выкарыстоўваючы актыўную пазыцыю, бярэ ініцыятыву ў свае рукі і апярэджвае думку «праціўніка» загадзя падрыхтаванымі хадамі ў форме пытаньняў альбо меркаваньняў. Пры высокім тэмпе падачы пытаньняў дапытваны, прыняўшы гэты тэмп, акажацца ня ў стане добра абдумываць і «расьцягваць» адказ. Існуе і шэраг іншых тактычных прыёмаў допыту.



vytoki.net

# ПСЫХАЛЁГІЯ ПЕРАТРУСУ

У ходзе сьледзтва асаблівая роля належыць ператрусу. У працэсе ператрусу можна знайсьці розныя аб'екты, якія маюць значэньне для справы, якая расьсьледуецца.

Ператрус - гэта сьледчае дзеяньне, накіраванае на прымусовае дасьледаваньне асобы, памяшканьняў, забудоваў, участкаў мясцовасьці, якія знаходзяцца ў распараджэньні асобы і чальцоў ейнай сям'і ці якой-небудзь арганізацыі, у якіх робіццаператрус, для адшуканьня і канфіскацыі аб'ектаў, якія прыхоўваюцца і маюць значэньне для справы.

Прымусовы характар перетрусу, узьнікненьне ў шэрагу выпадкаў канфліктных сытуацыяў, пошукавыя цяжкасьці зьвязаны, як правіла, з павышэньнем псыхічнага напружаньня ўдзельнікаў дадзенага сьледчага дзеяньня, з асаблівай ягонай псыхалягізаванасьцю. Падрыхтоўка, якая папярэднічае перетрусу, ахоплівае два аспэкты - інфармацыйны і інтэлектуальны. Першы заключаецца ў зборы інфармацыі аб тым, у каго робіццаператрус, прычым інфармацыі ўсеахопнай, другі — у высоўваньні вэрсіяў, якія ў сваёй аснове ўтрымліваюць рэфлексыўнае кіраваньне.

Збор інфармацыі, у сваю чаргу, уключае:

1) інфармацыю адносна памяшканьня, ягонага разьмяшчэньня, асаблівасьцяў, подступаў, уваходу, выхаду, а таксама ўбраньня, калі задачай перетрусу зьяўляеццаператрус памяшканьня;

2) інфармацыю аб асобе, якая падлягае перетрусу, што дазваляе сьледчаму атрымаць уяўленьне аб асобе ў аспэкце ацэнкі прафэсыйных і псыхалягічных рысаў, якія могуць быць выкарыстаныя асобай для ўтойваньня шуканых аб'ектаў. Сьледчая практыка сьведчыць аб існаваньні залежнасьці між прафэсыйнымі, псыхалягічнымі асаблівасьцямі асобы і выбраньнем ёй месца ўтойваньня таго альбо іншага аб'екту.

Да ліку дадзеных аб асобе, важных для перетрусу, адносяцца: прафэсія асобы; яе звычкі і схільнасьці; захапленьні; кола сяброў і сваякоў; антыпатыі і сымпатыі; магчымасьці ўтойваньня ў службовым альбо іншым памяшканьні. Пэўная частка гэтых зьвестак можа быць атрыманая сьледчым асабіста, іншая ж частка — апэратыўна-вышукванымі супрацоўнікамі па ягоным даручэньні. Папярэдняя падрыхтоўка да перетрусу патрабуе высьвятленьня асобы таго, у каго ён будзе адбывацца, на прадмет яе магчымага супрацьдзеяньня пры перетрусе.





Прадбачаньне магчымых непажаданых паводзінаў абшукванага дазваляе свавчасова скарэктаваць плян пранікненьня ў памяшканьне, дзе робіццаператрус, папярэдзіць зьнішчэньне вышукваных прадметаў. Пры вырабе тайнікоў, сховішчаў у некаторых выпадках абшукваныя выкарыстоўваюць цэлы шэраг фактараў псыхалягічнага характару, такіх, як:

1) разьлік на зьяўленьне фактару стомы і аўтаматызму. Так, шуканы дакумэнт часта кладуць у кнігу, якая знаходзіцца ў сярэдзіне кніжнай паліцы. Разьлік пры гэтым заключаецца ў тым, што кнігі будуць аглядаць зь нейкага краю паліцы, а да сярэдзіны паліцы ўжо праявіцца пэўны аўтаматызм, стома, пры якіх сьледчы ня будзе ўважліва перагортваць кожную старонку;

2) разьлік на грэблівасьць (закопваюць прадметы ў гной, апускаюць ў прыбіральню і г.д.);

3) разьлік на праяўленьне такту і іншых прыстойных пачуцьцяў з боку сьледчага (хаваньне аб'ектаў у ложку дзіцёнка, у ложку цяжкахворага, у магіле блізкіх сваякоў і г.д.);

4) наўмысная неахайнасьць у хаваньні прадмета (пакіданьне яго на бачным месцы);

5) адцягненьне ўвагі вырабам тайнікоў-двайнікоў (разьлік на тое, што пры знаходжаньні першага пустога тайніка астатнія такія самыя тайнікі аглядацца ня будуць);

6) разьлік на арганізацыю канфлікту падчас перетрусу з мэтай адцягненьня ўвагі для перахаваньня шуканага аб'екту.

Папярэдні збор усёй пералічанай інфармацыі, дасканалы яе аналіз дазваляе сьледчаму пасьпяхова зьдзейсьніць рэфлексыўнае кіраваньне, якое працякае па схеме імітацыі мысьленчага працэсу абшукванага. Беспасярэдняе рэфлексыўнае кіраваньне абумоўліваецца, з аднаго боку, рэальнай абстаноўкай і магчымасьцю хутка праверыць узьніклыя вэрсіі, а зь іншага - паводзінамі абшукванага і сумай рэакцыяў яго і акаляючых на дзеяньні сьледчага. У ходзе рэфлексыўнага кіраваньня сьледчы імкнецца ў думках разгадаць дзеяньні абшукаванага, стараецца «абагнаць» яго ў рэфлексыўных меркаваньнях, прымаючы пад увагу ягоны інтэлектуальны ўзровень. У прыватнасьці, пры прывядзеньні перетрусу сьледчы зьвяртае павышаную ўвагу на прадметы, знаходжаньне якіх у пэўным месцы абшукванага памяшканьня нелягічнае альбо выглядае штучным, а таксама на тыя зь іх, якія не адпавядаюць абстаноўцы памяшканьня, «ня ўпісваюцца» ў стыль. Адчуваючы моцнае эмацыйнае



vytoki.net

напружаньне, страх перад тым, што могуць знайсьці выкрывальныя прадметы і дакумэнты, абшукваны асабліва востра рэагуе на ўсё тое, што можа прывесьці да іхнага выяўленьня. Таму на набліжэньне сьледчага да тайнікоў і іншых месцаў схаваных аб'ектаў (па прынцыпе дзіцячай гульні ў «холадна-горача») абшукваны можа рэагаваць хваляванасьцю, нечаканай патлівасьцю, бледнасьцю, нэрвознасьцю, мітусьлівасьцю, а на адыход ад такіх месцаў — эмацыйнай «палёгкай». Назіраньне за паводзінамі і эмацыйнымі рэакцыямі асобаў, якія знаходзяцца ў абшукваным памяшканьні, сьледчы вядзе пастаянна, але дастаткова прыхавана, «ненавязьліва». Магчыма, назіраньне вядзе ня сам сьледчы, а па ягоным даручэньні адзін з найбольш дасьведчаных чальцоў групыператрусу.

У працэсе памаўленьня з абшукваным пры правядзеньні ператрусу можа выкарыстоўвацца такі прыём, як «слоўная выведка». Сутнасьць дадзенага прыёму заключаецца ў тым, што сьледчы аб'яўляе ўслых аб пераходзе да наступнай стадыі ператрусу (у іншае памяшканьне) з мэтай прасачыць за паводзінамі і рэакцыяй абшукванага і чальцоў сям'і. Такі слоўны раздражняльнік, узмоцнены станам нэрвова-псыхічнага напружаньня абшукванага можа выклікаць зь ягонага боку адпаведную рэакцыю, якая падкажа сьледчаму сапраўднае стаўленьне абшукванага да «слоўнай выведкі».







*Мікалай Шчур*, былы вязень СІЗА г. Чалябінску

## ВЫЖЫВАНЬНЕ Ў СЫСТЭМЕ ПРАВАСУДЗЬДЗЯ

Мікалай Аляксеевіч Шчур напісаў гэтыя «ўрокі» ў Чалябінскім сьледчым ізалятары, дзе ён знаходзіўся са студзеня па май 1996г. Здавалася б, пасьля «Архіпэлягу» Салжаніцына, «Маіх паказаньняў» Марчанкі ці «Дзёньнікаў» Кузьняцова нічога новага і цікавага аб расійскіх вязьніцах мы ўжо не даведаемся. І ўсё ж тэма не састарэла! Вязьніца сёньня – гэта новыя старонкі нашага жыцьця.

«Урокі» Шчура – гэта не мэмуары, не аповесьць, а дасьледаваньне. Гэта – памятка навасьпечанаму вязьню. Гэта ўрокі для дарослых. Дзецям яны не падыходзяць не таму, што дзеці іх не зразумеюць, а таму, што сытуацыя ў дзяцей у гэтай сыстэме крыху іншая, чым у дарослых, і парады ім патрэбныя іншыя. Але прачытаць ім гэта таксама карысна. Выжываньне пры сутыкненьні з праваахоўнымі органамі. Урокі для абывацеля: Урок першы. Да выкліку ў пракуратуру ; Урок другі. Выклік у пракуратуру ; Урок трэці. Першы допыт ; Урок чацьверты. Першая камэра ў ізалятары часовага ўтрыманьня ; Урок пяты. Допыт у якасьці падазраванага ; Урок шосты. Першы раз у вязьніцы ; Урок сёмы. Жыцьцё ў камэры ; Урок восьмы. Выпрабаваньне часам ; Урок дзявяты. Барацьба з сыстэмай ; Парады сваякам арыштаванага

### УРОК ПЕРШЫ. ДА ВЫКЛІКУ Ў ПРАКУРАТУРУ

1. Адмоўцеся ад думкі, што вы ніколі ня будзеце затрыманыя праваахоўнымі органамі і ніколі вас не абвінавацяць у зьдзяйсьненьні крымінальнага дзеяньня.

2. Адкладзіце ўсе забавы, перш чым вы не набудзеце Крымінальна-працэсуальны кодэкс (КПК), Крымінальны кодэкс (КК), Асновы крымінальнага заканадаўства (Асновы), Правілы ўтрыманьня пад вартай сьледча-арыштаваных (Правілы) і Канстытуцыю. Набыць гэтыя дакумэнты даволі лёгка, зьвярнуўшыся ў адпаведныя аддзелы кніжных крамаў. Калі ўказаных кніг там ня будзе, вам падкажуць адрас у Менску (220073, Менск, вул. Кальварыйская 62, Выдавецтва «Амалфея», тэл. 254-69-18, 254-69-47, 254-69-87), дзе гэтыя



vytoki.net

кнігі можна замовіць па пошце. Не шкадуйце грошай на ўказаныя пакупкі – у вязьніцы вы зразумееце, што грошы патрацілі недарма. Кнігі набудзьце ў тых выданьнях, дзе адразу даюцца паартыкульныя афіцыйныя камэнтары.

3. Вывучыце ўказаныя дакумэнты. У першую чаргу КПК, потым КК. Не палохайцеся, зразумеўшы, што за сваё жыцьцё вы шмат разоў зьдзяйсьнялі крымінальна караныя дзеяньні.

4. Не чакайце штохвіліннага арышту, але спакойна будзьце да яго гатовыя.

5. Прачытаўшы і вывучыўшы КПК і КК, вы адчуеце ўпэўненасьць у сабе і станеце разумна асьцярожным. 6. Кіньце курыць.

## УРОК ДРУГІ. ВЫКЛІК У ПРАКУРАТУРУ

1. Знайшоўшы павестку ў паштовай скрыні, не панікуйце. Не сьпяшайцеся ўзгадваць свае сумнеўныя справы.

2. На павестку не зьвяртайце ўвагі. Лічыце, вы ўвогуле не атрымоўвалі яе (па законе так яно і ёсьць). Зрабіць гэта трэба для таго, каб ня даць перавагі пракуратуры. Пакідаючы павестку ў паштовай скрыні, пракуратура прыніжае вас, бо павестка па законе павінна давацца асабіста, пад расьпіску. Не дазваляйце пракуратуры паводзіць сябе з вамі нахабна з самага пачатку. Таму павестку атрымоўвайце толькі ад кур'ера асабіста – ні праз дзяцей, ні ад суседзяў, ні якім іншым чынам.

3. Ня надта праяўляйце аптымізм (ён глупы ў дадзенай сытуацыі) і наіўную веру ў сваю невінаватасьць (хай вы сто разоў невінаватыя на самой справе), г.зн. у тым сэнсе, што ТАМ разьбяруцца і адпусьцяць, а загадзя вызначыцеся з адвакатам на выпадак арышту. Калі не асабіста яго, то папярэдзьце сяброў, што вам прыйшла павестка з пракуратуры і вам могуць спатрэбіцца паслугі адваката.

4. Будзьце гатовыя да таго, што вас могуць адвезьці з працы ў наручніках супрацоўнікі міліцыі. Альбо «ўзяць» на вуліцы.

5. Ні ў якім разе не адчувайце сябе вінаватым. Ні ў якім разе!

6. Падрыхтуйце рэчы на выпадак арышту: прадметы гігіены, зьмену бялізны, крыху прадуктаў, асадкі, алоўкі зь лястыкам, паболей паперы.

7. Не насіце з сабой дакумэнты, каштоўныя рэчы, нейкія дзелавыя паперы, асабістую перапіску.

8. Калі вы атрымалі павестку наўмысна і ведаеце дакладна,





калі пойдзеце ў пракуратуру, вызваліце ўсе кішэні ад усяго. Асабліва дасканала праверце, ці выклалі вы дакумэнты, вазьміце з сабой зубную шчотку і пасту.

9. Будзьце гатовыя да таго, што з допыту вы можаце не вярнуцца – сесьці за краты. Да гэтага павінны быць гатовыя і вашы хатнія, і падначаленыя, калі вы – кіраўнік. Аб падначаленых паклапаціцеся асабліва: ці ёсьць грошы на рахунку і на заробак і г.д.

10. Вазьміце з сабой КП і КПК, калі яны ў вас ёсьць.

11. Не панікуйце!

## УРОК ТРЭЦІ. ПЕРШЫ ДОПЫТ

1. У дзьверы кабінэту сьледчага ўваходзьце ўпэўнена, у душы ў вас не павінна быць месца пачуцьцю віны. Ведайце: сьледчы нічым ня лепшы і не вышэйшы за вас, у тым ліку і ў сэнсе чысьціні перад законам.

2. Памятайце, у гэтым доме ў вас сяброў няма.

3. Ні ў якім разе ніколі ня верце сьледчаму. Ніколі не згаджайцеся на ягоныя прапановы – любыя.

4. Калі вам скажуць, навошта вас выклікалі, і папярэдзяць аб адказнасьці, запатрабуйце тлумачэньня сваіх правоў. Ня верце сьледчаму на слова, патрабуйце прад'яўленьня вам тэкстаў КП, КПК, усіх артыкулаў, указаных у блянках, якія вам даюць падпісаць.

5. Ніколі нічога не падпісвайце, не прачытаўшы. Калі прачыталі і не пагадзіліся з прачытаным – не падпісвайцеся, пакуль ня будуць унесеныя папраўкі.

6. На ўсе пытаньні адказвайце сьцісла: так, не. Ні ў якім разе не захапляйцеся няяснымі тлумачэньнямі, не прыводзьце дапаўненьняў, тлумачэньняў, апісаньняў падзеяў. У выпадку нейкіх сумневаў гаварыце: «Цяжка адказаць».

7. Памятайце: усё, што будзе сказана вамі, можа быць і, хутчэй за ўсё, будзе выкарыстана супраць вас – і гэта не пустая фраза. Часьцей за ўсё ў абвінавачваньні сьледчы абапіраецца на паказаньні менавіта першага допыту.

8. Памятайце, у 99 выпадках са 100 абвінавачваньнем для сьледзтва і падставаю для абвінаваўчага прысуду служаць паказаньні самога абвінавачванага.

9. Будзьце гатовыя да таго, што зь першага допыту вы выйдзеце ня сьведкам, а падазраваным, і не дамоў, а ў ізалятар часовага ўтрыманьня (ІЧУ). Але не палохайцеся гэтага.

10. Заўсёды памятайце, што сьледчы зусім не разумнейшы



vytoki.net

за вас і ня больш прафэсыйны ў справе вядзеньня допытаў і сьледзтва ўвогуле. Ніякай сьледчай навукі няма – усё вызначаецца здаровым розумам, недасканаласьцю чалавечай душы і агульным культурным узроўнем. Калі сьледчы нэрвуецца альбо пачынае на вас крычаць і палохаць вас – гэта верная адзнака таго, што нічога ў яго на вас няма.

11. Пры першым крыку і першых пагрозах адразу ж спыняйцеся даваць паказаньні і не ўзнаўляйце іх да таго моманту, пакуль перад вамі ня выбачацца. Калі і пасьля гэтага на вас накрычалі (альбо зьняважылі любым іншым чынам) – змаўкайце назаўсёды для гэтага сьледчага.

12. Калі вы адчуваеце, што адказ на пытаньне будзе супраць вас, — не адказвайце. На гэта ў вас маецца законнае права, дадзенае Канстытуцыяй: нікога нельга прымушаць даваць паказаньні супраць сябе.

13. Ня бойцеся сьледчага. Ніколі. Ня бойцеся ні раззлаваць яго, ні пакрыўдзіць: памятайце, што ніякіх добрых пачуцьцяў да вас ён ня мае, і ваш лёс залежыць не ад стаўленьня да вас сьледчага.

14. Калі вам будуць намякаць альбо прапаноўваць адкупіцца – не згаджайцеся ніколі: па-першае, гэта можа быць правакацыяй (што малаверагодна, у большасьці выпадкаў сьледчыя сапраўды хочуць атрымаць хабар), па-другое, тым самым вы прызнаеце сваю віну і цяпер сьледзтва зможа «ўтапіць» вас у любы момант.

15. Калі вас затрымліваюць (ці заключаюць пад варту), адразу патрабуйце адваката.

## УРОК ЧАЦЬВЕРТЫ. ПЕРШАЯ КАМЭРА Ў ІЧУ

1. Пераступіўшы парог камэры, зразумейце: вы цяпер адзін, ніякай дапамогі вам ня будзе, разьлічваць цяпер вам трэба толькі на самога сябе. Гэта мабілізуе.

2. Не палохайцеся ні віду камэры, ні віду сукамэрнікаў – і тое і другое па першым уражаньні можа быць жудасным.

3. Ня верце таму, што вас некуды выклічуць заўтра альбо нехта прыйдзе пацікавіцца вамі раніцай: напрацягу бліжэйшых трох дзён вам будуць толькі выдаваць малую колькасьць нясмачнай ежы і на ўсе вашыя пытаньні будуць коратка адказваць: «Нічога ня ведаем». Так робіцца сьледзтвам спэцыяльна, каб зламаць вас. Ведайце, што сьледзтва пра вас памятае і праз ахову, сукамэрнікаў уважліва сочыць за вамі ўсе гэтыя дні. А жонка не знаходзіць сабе месца, імкнучыся перадаць вам прадукты, адзеньне, лекі, але





яе проста не пускаюць да вас і перадачы ад яе намерана не бяруць. На свабодзе віруе жыцьцё, зьвязанае з вамі, таму камэрная цішыня абманлівая.

4. У камэры не распускайце язык аб сваёй справе. Адказвайце таксама сьцісла, як на першым допыце, дакладна выконвайце парады, дадзеныя ў трэцім уроку.

5. Будзьце гатовымі да правакацыяў як з боку служачых вязьніцы, так і з боку сукамэрнікаў – яны (адзін зь іх практычна заўсёды) могуць быць падасланыя сьледзтвам.

6. Будзьце гатовымі да таго, што нечакана вас могуць этапаваць у СІЗА (сьледчы ізалятар), г.зн. у вязьніцу. Сам факт этапу прыціскае, аднак у вязьніцы нашмат лягчэй, чым у ІЧУ. Парадокс, але гэта так.

7. Адмоўцеся (надоўга) ад думак аб смачнай ежы – ешце ўсё, што даюць, нягледзячы на від, смак і г.д. Для заспакаеньня можаце ўзгадваць лёс вязьняў ГУЛАГу: ніякага параўнаньня.

8. Ня думайце аб сям'і. Ім вы не дапаможаце. Не трывожце душу перажываньнямі аб іх.

9. Будзьце спакойнымі. Злосьць, нянавісьць, перажываньні забіраюць сілы.

10. Старайцеся ноччу спаць, а днём быць бадзёрым.

11. Сачыце за сабой, выконвайце правілы гігіены.

12. Марнуйце час перш за ўсё на адпачынак: адсыпайцеся, чытайце, пішыце, гуляйце – усё, што магчыма.

13. Не падтрымлівайце пустых размоваў, не паддавайцеся спакусам нешта пазычыць.

14. Майце мужнасьць кінуць курыць, інакш вы рызыкуеце апусьціцца да стану чалавека, які пастаянна просіць цыгарку ў каго заўгодна і за што заўгодна. Пасьля гэтага сваю справу вы адназначна прайграеце.

15. Зразумейце: на доўгія месяцы ў вас пачалося абсалютна новае для вас жыцьцё, якое большай часткай ад вас не залежыць.

16. Заглыбцеся ў сябе. Займайцеся не самакапаньнем, самазьніштажэньнем альбо пакаяньнем, а самааналізам. Ні ў якім разе не ўваходзьце ў стан вінаватасьці.

17. Напішыце заяву з патрабаваньнем абаронцы. Ні ў якім разе не згаджайцеся на адваката, якога прапаноўвае сьледчы. Зрабіце заяву, што адмаўляецеся прымаць удзел у любых сьледчых дзеяньнях бяз вашага адваката. (Менавіта вашага, якога вы выбралі).

18. У камэры паводзьце сябе незалежна і роўна: вы ўсе тут у



vytoki.net

аднолькавым становішчы.

19. Вывучайце КПК і КК, калі яны ў вас ёсьць.

## УРОК ПЯТЫ. ДОПЫТ У ЯКАСЬЦІ ПАДАЗРАВАНАГА

1. На допыт згаджайцеся толькі ў прысутнасьці вашага адваката. Гэта пралугледжана законам.

2. Не забывайцеся, што вы не абавязаныя сьведчыць супраць самога сябе.

3. Патрабуйце выканананьня ўсіх працэсуальных нормаў. Дробязяў у гэтай справе няма.

4. Не давярайце сьледчаму ні ў чым: у 99 выпадках з 100 ён блефуе. Не сьпяшайцеся верыць у тое, што сябры вас агаварылі, але і не адкідайце гэты варыянт, будзьце да яго гатовыя.

5. Вашыя хаўрусьнікі – час, адказ «ня памятаю», вера ў сям'ю.

6. Правярайце дакладнасьць усіх запісаў у пратаколе допыту, запаўненьня ўсіх графаў, у тым ліку часу і даты допыту.

## УРОК ШОСТЫ. ПЕРШЫ РАЗ У ВЯЗЬНІЦЫ

1. Уявіце сабе, што вы цалкам згубілі свой статус, які быў у вас на свабодзе: цяпер да вас ставяцца як да нікчэмнасьці ўсе турэмшчыкі – ад шараговага да начальніка вязьніцы. Запомніце гэта, і хай вас гэта не абражае. Узгадайце Хрыста: «Божа, прабач ім, бо ня ведаюць, што твораць». Гэтыя – ведаюць, але будзьце да іх абыякавымі.

2. Падрыхтуйце сябе да гнятлівага віду як памяшканьняў вязьніцы, так і ейных служачых. У капцёрцы вазьміце матрац, падушку, коўдру, пасьцельную бялізну, лыжку, кубак – усё, што прапануюць.

3. Не палохайцеся, заходзячы ў камэру: адчуваньне, што вы трапілі ў пекла, у зладзейскі прытон – пройдзе. Няголеныя, злыя людзі праз паўгадзіны могуць выклікаць у вас сымпатыю.

4. Першая ваша камэра ў вязьніцы – карантын. Тут усё агульнае, ня бойцеся што-небудзь браць са стала, ніхто вам нічога ня скажа. Тут няма ашуканства сярод арыштаваных. Тут вам патлумачаць звод камэрных правілаў. Але і не забывайцеся: і тут могуць быць падсадныя.

5. Ня трэба бязьмежна давяраць сукамэрнікам: цалкам магчыма, што вы сярод іх найадукаванейшы, найразумнейшы і наймацнейшы, а яны толькі выстаўляюцца дасьведчанымі.

6. Імкніцеся знайсьці сваё месца ў камэры. Зразумейце, чым вы можаце быць карысныя іншым.

7. Сьпіце пры любой магчымасьці, як толькі пабачыце нары свабоднымі. За рэчы не клапаціцеся – тут не крадуць.

8. Ні ў якім разе не пераходзьце на турэмны жаргон – заставайцеся чалавекам і тут.

9. Памятайце: на волі пра вас не забыліся і імкнуцца ўсё зрабіць, каб вызваліць вас. Ім цяпер, можа, цяжэй, чым вам.

## УРОК СЁМЫ. ЖЫЦЬЦЁ Ў КАМЭРЫ

1. У камэры вам трэба мець сваё: лыжку, кубак, міску, мыла, зубную пасту і шчотку, вяхотку, ручнік, пасьцельную бялізну, шлёпкі (тыя, якія можна мачыць). З прадуктаў: сала, цыбуля, часнык, згушчанае малако. Зь лекаў – вашы традыцыйныя: ад кашлю, застуды, страўнікавых і галаўных боляў; як можна больш вітамінаў, асабліва вітаміну С. Можна мець кіпяцільнік, тэлевізар. Трэба мець асадку, сшытак, шахматы (даміно, шашкі – па жаданьні), нешта адукацыйнае.

2. У вязьніцы вы нікому не патрэбныя (і служачым — яны вам неназаляюць), таму падумайце, як вы будзеце марнаваць шмат вольнага часу.

3. Уваходзячы ў камэру, павітайцеся, спытайце, куды можна кінуць матрац. Вас могуць праверыць, указаўшы месца побач з прыбіральняй. Усьміхніцеся і пакладзіце матрац на любое месца, але ня побач з прыбіральняй.

4. Спакойна чакайце – вам скажуць, дзе і калі вы будзеце спаць. (Камэры перапоўненыя, таму спаць прыдзецца па чарзе).

5. Калі вас запросяць для размовы ў куток камэры вельмі пагрозьлівага выгляду людзі і прапануюць падзяліцца альбо памяняцца рэчамі, не пагаджайцеся ні на тое, ні на іншае, нават не тлумачачы прычынаў: «Не хачу». А людзей гэтых ня бойцеся – яны грозныя толькі з выгляду.

6. Запамятайце: ні адну вашу рэч (уключаючы перадачы) ніхто бяз вашай згоды ня возьме і ў вас не адбярэ: права ўласнасьці ў камэры сьвятое. Не забывайцеся і вы аб гэтым – не дакранайцеся да чужога, не спытаўшы папярэдняга дазволу.

7. Не трапляйце ў залежнасьць ад чаго-небудзь альбо каго-небудзь: адмоўцеся ад шкодных звычак, тым больш дурных – курэньня, да прыкладу. Залежнасьць ад курэньня ледзь не асноўная прычына падзеньня чалавека ў вязьніцы.

8. Сачыце за сабой: пры першай магчымасьці мыйцеся, мыйце адзеньне, падстрыгайцеся і г.д.





vytoki.net

9. Вядзіце рацыянальны лад жыцьця: па магчымасьці збалянсавана харчуйцеся (калі ёсьць перадачы), рэгулярна ўжывайце вітаміны, хваробу глушыце пры першым адчуваньні, што можаце захварэць. Старайцеся прытрымлівацца рэжыму; спаць пажадана ўначы. Як можна больш рухайцеся.

10. Памятайце, што камэра – ваш дом на некалькі месяцаў, а то і гадоў.

11. Таму – абжывайцеся. Аднак старайцеся не прызвычаіцца ні да камэры, ні да людзей, каб перавод у іншую камэру (што практыкуецца турэмшчыкамі часта) ня стаў для вас трагедыяй.

12. Трымайцеся незалежна. Калі вам падалося, што знайшлі чалавека (двух, трох...), з кім вам лягчэй суіснаваць, аб'ядноўвайцеся зь ім. Але ня вельмі сьпяшайцеся з гэтым.

13. Не дапускайце ператварэньня сябе ў рабаўладальніка: вам можа быць прапанаваны раб. Апусьціцца ў вязьніцы можна па-рознаму: стаць «гаспадыняй» (рабом) альбо стаць уладальнікам «гаспадыні», і тое і іншае – разбэшчваньне душы.

14. Усьвядомце: вы трапілі ў жорны праваахоўнай сыстэмы, яны вас перамолваюць не з-за непрыязнасьці да вас асабіста, а з-за сваёй антыгуманнай і чалавеказьніштажальнай сутнасьці – для гэтага яны і створаныя. Узгадайце найноўшую гісторыю Расіі – нічога не зьмянілася. У вязьніцы вы павінны гэта зразумець.

15. Памятайце: на волі вас не забываюць. І калі ў інфармацыйным вакууме вязьніцы ў вас ствараецца ўражаньне, што вы пахаваныя жывым, гэта няверна – пра вас памятаюць і робяць усё для вашага вызваленьня.

16. Не засяроджвайцеся ў думках на сваёй справе, не канцэнтруйце ўвагу на сваім цяперашнім становішчы, малюючы яго жудасным, немагчымым і інш., — ваша становішча, хай непрыемнае, нязручнае і г.д., усё ж у тысячу разоў лепшае за становішча вязьняў ГУЛАГу, а людзі выжывалі і там.

17. Памятайце, што б ні здарылася, хай нават вы будзеце асуджаныя, жыцьцё на гэтым не сканчаецца. І наперадзе вас чакаюць спатканьні з жонкай, апэляцыі, перасуд, амністыі.

18. Памятайце: усе жахі, якія вам малявалі пра жыцьцё ў «хаце» (г.зн. у асноўнай камэры), існуюць на самой справе, але зусім не настолькі жахлівыя, бо ступень іхнай «жахлівасьці» залежыць ад вас саміх.

19. Табу камэрнага жыцьця, якія існуюць, носяць часьцей гумарыстычны характар, калі ставіцца да іх спакойна.





20. Рэальныя камэрныя законы простыя: недатыкальнасьць прыватнай уласнасьці і несупраціў уласнай волі. Гэтыя прынцыпы як абараняюць вас, так і зьяўляюцца вашымі ворагамі.

21. Асноўны ваш вораг у камэры: ваша слабасьць перад спакусамі і вашы дурныя звычкі. Не паддавайцеся новым дурным звычкам. Адна зь іх – піць чыфір.

22. Ніколі нічым не абменьвайцеся (адзеньнем, рэчамі, прадуктамі...) з сукамэрнікамі.

23. Ніколі нічога не прасіце ў сукамэрнікаў.

24. Ніколі ня ўвязвайцеся ў «разборкі», калі вас ня просяць.

25. Не прымайце ніякіх «страйкаў» супраць камэрных парадкаў, наколькі б дзікімі яны вам не здаваліся, — жывіце самі па сабе. Жаданыя для вас зьмены наступяць самі, празь некаторы час, з-за таго, што іншыя на вашым прыкладзе зразумеюць: і ў вязьніцы можна заставацца чалавекам.

## УРОК ВОСЬМЫ. ВЫПРАБАВАНЬНЕ ЧАСАМ

1. Выпрабаваньне часам – найбольш моцнае ўзьдзеяньне на вас у вязьніцы.

2. Вам здаецца, што ўсе забыліся на вас: і «органы», і сям'я. Будзьце ўпэўнены, што гэта ня так. Атмасфэра вязьніцы абманлівая, памятайце гэта і, калі гэта вас не супакоіць, паўтарайце сабе самі: «Сьледзтва спэцыяльна робіць так, каб у мяне склалася ўражаньне, што я забыты ўсімі».

3. Яшчэ раней вы павінны былі зразумець, што заключэньне ваша будзе доўгім: вы не ў Амэрыцы – тым больш справядлівага суду няма ў Расіі. Прыміце гэта як дадзенасьць, бо вы ня ў сілах тут нешта зьмяніць.

4. Прысьвяціце «час забыцьця» самому сабе. Азірніцеся на мінуўшчыну.

5. Зірніце ў будучыню. Рабіце гэта спакойна: вам сьпяшацца няма куды.

6. Займіцеся самаадукацыяй. Цалкам магчыма, што гэты пэрыяд спакойнага жыцьця – адзіны ў вас. Выкарыстоўвайце яго.

7. Ні ў якім разе не засяроджвайцеся на сваёй справе: той аб'ём інфармацыі, які ў вас быў, вы даўно ўжо перапрацавалі, нічога новага ў вас няма – чакайце зрухаў.

## УРОК ДЗЯВЯТЫ. БАРАЦЬБА З СЫСТЭМАЙ

1. Памятайце: вы павінны змагацца з «правасудзьдзем», а не чакаць ад яго літасьці – яе ня будзе. Таму вельмі добра



vytoki.net

вывучыце Крымінальна-працэсуальны кодэкс і сачыце за яго выкананьнем сьледзтвам і служачымі вязьніцы. Адразу ж пішыце скаргі пракурору, ва ўпраўленьне юстыцыі, дэпутатам усіх узроўняў, у Генпракуратуру – як толькі пабачыце любое парушэньне закону сьледзтвам альбо вязьніцай. Пакідайце сабе копію.

2. Выкарыстайце ўсе магчымасьці, каб самому дабіцца выхаду на свабоду: пішыце хадайніцтвы сьледзтву, пракурору, скаргі ў суд адразу ж, як зьявяцца для гэтага падставы.

3. Ня бойцеся Сыстэмы, ня бойцеся сьледзтва – супраціўляйцеся. Толькі барацьба падтрымае вас, ня дасьць вам апусьціцца душой і целам.

## ПАРАДЫ СВАЯКАМ АРЫШТАВАНАГА

1. Перш за ўсё – не панікуйце. І не спадзявайцеся, што ТАМ разьбяруцца і хутка выпусьцяць – гэта наўрад ці здарыцца.

2. Прыміце гэты арышт як чарговае, але не сьмяротнае выпрабаваньне, якое выпала на ваш агульны лёс.

3. Не настойвайце на хуткім спатканьні – клопат гэты пусты і нічога ні вам, ні яму ня дасьць, нават калі спатканьне і адбудзецца.

4. Пачынайце адразу рыхтаваць перадачу.

Вось якая перадача павінна быць у першы раз: - зубная шчотка, зубная паста – 1; - грэбень (не мэталічны); - аднаразовы станок для галеньня (у далейшым я буду мець на ўвазе мужчын); - ручнік (невялікі); - мыла (па кавалку туалетнага і гаспадарчага); - пасьцельную бялізну: навалачку, дзьве прасьціны; - шлёпкі, якія можна мачыць; - зьмену бялізны; - кубак (літровы і звычайны), міску, лыжку (не стальную); - кіпяцільнік; - ніткі, іголкі; - касьцюм спартовы; - асадкі, алоўкі; - літаратуру (што любіць); - вітаміны і «ягоныя» лекі; - якую-небудзь гульню (што любіць).

Усё. Не мудрыце зь ежай – яна ў першыя дні абсалютна не патрэбная. А ўсе рэчы і адзеньне перадавайце старыя: вязьніца – ня месца сьвецкіх прыёмаў.

5. Калі сьледчы дазволіць падрыхтаваць «вашага» да этапу ў вязьніцу, то дайце яму наступную ежу: тушаніна –2 бляшанкі, згушчанае малако –2 бляшанкі (малако зварыць), сала – 1 кг., цыбуля – 1 кг., часнык – 0,3 кг., маянэз - 1 слоік (не шкляны), карамель – 1 кг., гарбата –1 пачак. Канечне, усё залежыць ад вашых магчымасьцяў, але майце на ўвазе, што шмат ежы ніколі перадаваць ня трэба: яна проста ня дойдзе да вашага адрасату – не таму, што адбяруць (хаця і гэта можа быць), а





таму, што ён напачатку будзе паводзіць сябе як нармальны чалавек і ўсё раздасьць. Вам жа ўсю вязьніцу ў любым выпадку не накарміць.

6. У далейшым старайцеся перадачы зьбіраць невялікія, але часьцей, вы павінны памятаць: у вязьніцы галоўнае – ня колькі перадаюць і чаго, а адчуваньне таго, што цябе памятаюць на волі.

7. Шукайце адваката і як можна часьцей арганізоўвайце сустрэчы вязьня з адвакатам. Тады і вы будзеце ведаць, як ён пачуваецца і што яму трэба, і ён будзе спакойны. Адвакат жа ў сустрэчах з падабаронным не абмежаваны ні ў часе, ні ў колькасьці сустрэчаў. Ён – выратаваньне ня толькі для таго, хто за кратамі, але і для вас.

*****

*(Упершыню апублікавана ў «Экспрэс-кроніцы»)*



vytoki.net

## ДАДАТКІ

**ПАСТАНОВА аб прымяненьні меры стрыманьня ў выглядзе асабістага паручыцельства**

г. Менск «___» __________199__ г.

Сьледчы сьледчага аддзелу ......................... .................. , разгледзеўшы матэрыялы крымінальнай справы № XXXX па абвінавачваньні .....................................ў зьдзяйсьненьні крымінальнага злачынства, прадугледжанага арт.XXX КК РБ, устанавіў: (апісаньне ўстаноўленых абставінаў злачынства) Прымаючы пад увагу, што ....... зьдзейсьніў злачынства ўпершыню, дабрасумленна ў ім раскайваецца, па месцы працы і жыхарства характарызуецца станоўча, мае пастаяннае месца жыхарства і няма падставаў лічыць, што ён будзе перашкаджаць устанаўленьню праўды па справе, а за ягоныя належныя паводзіны і сваечасовую яўку ручаюцца заслугоўваючыя даверу .............. , пражываючы .................і ...................... , пражываючы.............................. , кіруючыся арт.арт.84, 86, 87, 89 КПК РБ, пастанавіў: Прымяніць у дачыненьні да абвінавачванага .................., ХХ месяца ХХХХ году нараджэньня, пражываючага па вул. ................... , ХХ, кв.ХХ у г.Менску меру стрыманьня ў выглядзе асабістага паручыцельства заслугоўваючых даверу ............................і ........................... , у чым аб'явіць абвінавачванаму і паручыцелям.

Сьледчы капітан міліцыі /........................./

Пастанова нам аб'яўлена «___» _________ 199__ г.
Абвінавачваны /......................./
Паручыцелі /......................./ /......................./



г.Менск «___» ________ 199__ г.

Мы, што ніжэй падпісаліся, ................................. , старшы майстра заводу «Калібр», які пражывае .......................... , прад'явіў пашпарт сэрыі .............., № ..................... , выдадзены «___» __________ 199__ г. АУС ...................... , і ................................... , (месца працы і пасада, адрас жыхарства, пашпартныя дадзеныя, ручаемся за тое, што абвінавачваны Іваноў Іван Іванавіч, пражываючы ....................... , знаходзячыся на волі, не схаваецца ад сьледзтва і суду, ня будзе перашкаджаць устанаўленьню праўды па крымінальнай справе і ня будзе займацца злачыннай дзейнасьцю. Пра сутнасьць справы і абвінавачваньня, прад'яўленага Іванову І.І. у зьдзяйсьненьні злачынства, прадугледжанага арт.ХХ КК РБ, мы пастаўленыя ў вядомасьць. Нам таксама патлумачана ўстаноўленая арт.ХХ КПК РБ адказнасьць паручыцеляў у выпадку неналежных паводзінаў Івановым І.І. альбо ўхіленьня яго ад яўкі да сьледчага альбо ў суд.

Паручыцелі /........................../ /........................../

Падпіску аб асабістым паручыцельстве ўзяў сьледчы СА АУС выканкаму ................ раёну г.Менску,
капітан міліцыі /............................/





vytoki.net

## ПАДПІСКА АБ НЯВЫЕЗЬДЗЕ

г.Менск «__» ____________ 199__ г.

Я, ............................ , пражываючы ў г.Менску па вул. ...................... , дом XX, кв. XXX, даю гэтую падпіску ў тым, што бяру на сябе абавязак да сканчэньня папярэдняга сьледзтва і разгляду судом крымінальнай справы па абвінавачваньні мяне ў зьдзяйсьненьні злачынства, прадугледжанага арт.XX КК РБ, не выяжджаць зь г.Менску, не мяняць месца жыхарства без дазволу сьледзтва, пракурора альбо суду і зьяўляцца па іхным першым запатрабаваньні. Мне паведамлена пра тое, што ў выпадку парушэньня мною дадзенай падпіскі ў дачыненьні да мяне на падставе арт. XX КПК РБ можа быць прыменена больш строгая мера стрыманьня.

Абвінавачваны /........................./

Падпіску браў сьледчы СА АУС выканкаму Маскоўскага р-ну г.Менску капітан міліцыі /............................/





## ПАДПІСКА аб неразгалошваньні дадзеных папярэдняга сьледзтва

г.Менск «__» ____________ 199__ г.

Я, ..........................., пражываючы ў г.Менску па вул. ........................., XX, кв. XXX, будучы сьведкам па крымінальнай справе аб ............................, даю ў адпаведнасьці з арт.141 КПК РБ падпіску сьледчаму сьледчага аддзелу Маскоўскага РАУС капітану міліцыі ......... аб тым, што бяру на сябе абавязак не разгалошваць безь ягонага дазволу вядомыя мне дадзеныя папярэдняга сьледзтва па дадзенай справе. Адначасова мне патлумачана, што ў выпадку парушэньня дадзенай падпіскі я магу быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці па арт. 180 КК РБ. Са зьместам арт. 180 КК РБ азнаёмлены.

Сьведка /......................../

Сьледчы капітан міліцыі /......................./



vytoki.net

***Пры падрыхтоўцы матэрыялу выкарыстоўваліся:***
*Енікееў М. І. Асновы агульнай і юрыдычнай псыхалёгіі. М., 1996.*
*Ліўшыц Е. М., Белкін Р. С. Тактыка сьледчых дзеяньняў. М., 1997.*
*Рацінаў А.Р. Пeратрус і выманьне. М., 1961.*
*Дулаў А.В. Судовая псыхалёгія.*
*Шыханцоў Г.Г. Юрыдычная псыхалёгія.*
*Філонаў Л.Б., Давыдаў В.І. Псыхалягічныя прыёмы допыту абвінавачванага // Пытаньні псыхалёгіі. 1966. №6.*
*Баеў О.Я. Тактыка сьледчых дзеяньняў. Варонеж, 1995.*
*Гранат Н.Л. Характарыстыка сьледчых задач і псыхалягічныя мэханізмы іхнага вырашэньня. М., 1973.*

*****



vytoki.net